На поўным люзе ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ЮРЫЙ ХАРКЕВІЧ ☞ 11

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 44 (2529) Год XLIX | Беласток, 31 кастрычніка 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Іаанна Якубовіч і яе чацвёртакласнікі

Хачу навучыцца па-беларуску!

— Ужо мяне тут ведаюць, — кажа Іаанна Якубовіч.

Сярод пасажыраў аўтобуса на трасе Саколка — Шудзялава, Іаанна распазнае бацькоў сваіх вучняў.

Яны апякуюцца маладзенькай настаўніцай, якая жыва кідаецца ў вочы, бо ў дарозе чытае беларускія кніжкі.

— Вось нядаўна, калі мы набліжаліся да Бабікаў, падышла адна пані і кажа:

— *Вам, цяпер высаджвацца трэба! Каб не пераехалі сваёй школы.*

* * *

Школу відаць ужо здалёк, белы трохпавярховы будынак знаходзіцца ў пачатку вёскі.

— *Добры дзень! Добры дзень, вітаюць нас дзеткі.*

Хоць беларуская мова тут ад пачатку кастрычніка, ужо на Дзень настаўніка найстарэйшыя дзяўчаты падрыхтавалі сюрпрыз.

— To trzeba było zobaczyć, — узрушаецца дырэктар школы Гражына Куклік. — Jak one tańczyły i śpiewały!

Выступленне выглядала так — дзяўчынкі выйшлі на сцэну і ў стылі гіп-гоп праспявалі і затанчылі верш Якуба Коласа „Музыкі".

На школьным калідоры яшчэ красуюцца партрэты настаўнікаў, намаляваныя пад іх свята дзеткамі. Сярод іх сустракаем і спадарыню Іаанну.

І гэта не ўсё, у настаўніцкім пакоі чакае яе цудоўны букет ад вучняў.

— A dzisiaj na informatyce ktoś puścił plotkę, że białoruski jest odwołany, i dzieci bardzo się zmartwiły, — кажа Гражына Куклік.

* * *

На ўроку ў чацвёртым класе дзеці паўтараюць завучаны матэрыял:

— *Мяне завуць Дарэк Бароўскі. Я жыву ў Грыбоўшчыне. Мне дзесяць гадоў.*

Сябра з парты адказвае:

— *А мяне завуць Дарэк Бародзіч. Я жыву ў Сухінічах. Мне таксама дзесяць гадоў.* Чацвёртакласнікі ўмеюць ужо запісаць словы па-беларуску. Несумненна дапамагае знаёмства рускай мовы. У сшытках дзеці размалявалі бел-чырвона-белыя сцягі. А згаданы ўжо Дарэк Бароўскі размаляваў два сцягі, гістарычны і афіцыйны. Хлопец ахвотна апавядае пра зацікаўленне беларускай мовай:

— Бо я хачу навучыцца размаўляць па-беларуску, каб ведаць мову сваіх дзядоў. Мама хлапчука родам з Вялікай Бераставіцы.

— А я хачу ведаць усе мовы, — кажа Сільвія Снарская, таксама з Грыбоўшчыны.

Іаанна чытае ўголас беларускую казку „Зайздросны дзядзька". Дзеці жыва яе ўспрымаюць, смяюцца са свойскага „дзядзькі", а пасля ірвуцца, каб расказаць пачутае.

* * *

Хоць у Пачатковай школе ў Бабіках дзеці з паловы Шудзялаўскай гміны, тут усяго 82 дзетак (уключна з нулявым класам). Дзевятнаццаць — ходзіць на беларускую мову.

— Большасць гэта каталікі, — адзначае дырэктар.

— А якая была матывіроўка, калі вы арганізавалі навучанне?

— Наша гміна супрацоўнічае са школай у Адэльску на Беларусі, — кажа Г. Куклік, — і мы таксама хацелі б супрацоўнічаць з дзяцьмі па другім баку мяжы. Асабліва таму, што ў многіх там сем'і.

Абавязвае і імя патрона школы, якім тут з'яўляецца Адам Міцкевіч. На найбліжэйшую ўрачыстасць Г. Куклік думае запрасіць консула РБ.

— Może uda nam się zorganizować wycieczkę do Nowogródka?

Навучанне беларускай мовы на Сакольшчыне мае доўгую традыцыю, з 1959 года, яе вывучала 2 019 вучняў у 20 школах*. Апошняя інфармацыя пра навучанне датычыць вёскі Астраўкі:

*W roku szkolnym 1974/75 Wydział Oświaty i Wychowania Urzędu Powiatowego w Sokółce zlikwidował nauczanie języka białoruskiego z powodu odejścia nauczycielki na urlop macierzyński, — падаюць крыніцы***.

У саміх Бабіках раней не было навучання, хоць беларускую мову сустракаем у навакольных вёсках: Кнышэвічах, Сухінічах, Гаркавічах (якія з цягам часу далучылі ў Бабікі).

— Dzieci bardzo polubiły te lekcje, — кажа дырэктар, — cały czas ktoś przychodzi i pyta jak zapisać się na białoruski.

Ёсць таксама пагроза, настаўніца Іаанна Якубовіч даязджае на працу з Бельска-Падляшскага і на даезд у два бакі траціць амаль шэсць гадзін. Але не наракае:

— Урэшце маю час на непрачытаныя кнігі, — кажа.

Ганна Кандрацюк

* Паводле Юры Туронка

** Паводле Славаміра Іванюка

Дарога жыцця ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

Усё чалавечае жыццё — гэта перманентны выбар. Выбар паміж страхам і сумленнем. 17 кастрычніка на чарговым антыканстытуцыйным рэферэндуме беларусы кожны паасобку зрабілі свой выбар. Тыя, што сведама прагаласавалі па сутнасці за пажыццёвае кіраванне краінай адным чалавекам (рэальна гэта менш паловы грамадства) зусім не разумеюць, што яны прагаласавалі не за мір і дабрабыт...

Сяло Кленікі ☞ 8

BASOVKA

Частку нашых маладых „даследчыкаў" здзіўляе выразнае размежаванне часу ў далёкай мінуўшчыне. Быў час абавязкаў, быў і час гульні, аднак прапорцыі вызначаліся даволі жорстка. Забаву на вёсцы можна лічыць нешматлікімі хвілінамі, калі дазвалялася адпачыць, забыцца на манатонію штодзённых абавязкаў...

Бардаўская восень ☞ 9

Міхась Андрасюк ☞ л-І

Хіба можна сказаць, што кожны чалавек нейкім чынам стараецца выявіць сябе. Кожны шукае сваю прастору. Людзі выяўляюцца ў мастацтве, а і ў штодзённай празаічнай працы. Гэта нам павярхоўна так здаецца, што чалавек займаецца нейкім гандлем, на тое, каб выжыць, каб зарабіць на хлеб, але ён стараецца ў гэтым гандлі ўгледзець самога сябе. І я якраз адчуваю, што магу сябе выявіць словам, пісаным словам. У прозе. І хіба толькі так...

Праўда за намі ☞ п-І

Юрый Хмялеўскі

Усё ж не магу паверыць, што была гэта кімсьці дакладна спланаваная акцыя супроць нашай меншасці. Але, на жаль, можна тое так менавіта ўспрыняць, гледзячы на паводзіны чыноўнікаў і пагражаючыя паслядоўнасці. Асабліва мяне непакоіць тое, што паліцыя і пракуратура весці расследаванне ў справе „Нівы" назначылі вось беларусам або іх жонкам/мужам палякам...

9 770546 196000

Дзяды — дарога жыцця

Чалавеку наканавана жыць у страху — атэісты баяцца смерці, а вернікі таго, што з імі будзе пасля смерці. Усё чалавечае жыццё — гэта перманентны выбар. Выбар паміж страхам і сумленнем. 17 кастрычніка на чарговым антыканстытуцыйным рэферэндуме беларусы кожны паасобку зрабілі свой выбар. Тыя, што сведама прагаласавалі па сутнасці за пажыццёвае кіраванне краінай адным чалавекам (рэальна гэта менш паловы грамадства) зусім не разумеюць, што яны прагаласавалі не за мір і дабрабыт. Не за незалежнасць і заможнасць. Яны прагаласавалі за тое, што іх дзеці і ўнукі пойдуць служыць (чытай ваяваць на смерць) у гарачыя каўказскія кропкі (урокі Афганістана для такіх „сляпых выбарцаў" прайшлі марна). Яны прагаласавалі за тое, што іх штодзённа будуць прыніжаць і лічыць быдлам. За тое, што на вуліцах, хай сабе і ўпарадкаваных, будзе ўсё мацней гучаць расійскі мат з вуснаў падлеткаў, а з экранаў тэлевізараў ліцца, няхай сабе пры прыгожых застаўках, няспынная плынь хлусні і духоўнай атруты. За тое, што яны будуць бяднець далей і лічыць за шчасце кавалак каўбасы раз у месяц на свята. Але яны, як сказала калісьці адна вядомая гродзенская паэтка, няшчасныя ўжо тым, што глухія і сляпыя ад нараджэння.

Яшчэ большымі ахвярамі ёсць тыя, што аддалі свой голас за падман па прымусу і страху. Адзін з назіральнікаў расказваў мне як старшыня камісіі адкрыта фальшаваў вынікі на дзяльніцы, а сябры камісіі пры тым маўчалі. Не вытрымаўшы такога цынізму, назіральнік гучна заявіў: „Сярод вас тут няма аніводнага сумленнага чалавека!". Сябры камісіі толькі апусцілі вочы. Яны вартыя шчырага жалю, бо цяпер будуць жыць у суцэльнай нянавісці — да тых, хто прымусіў іх рабіць брудную справу, да тых, хто выкрыў іх падман, урэшце да саміх сябе, бо ў душы раз-пораз прачынаецца голас сумлення.

У кастрычніку 1937 года ў Беларусі ішлі масавыя расстрэлы нацыянальнай інтэлігенцыі. У кастрычніку 2004 года на нашай зямлі сустрэліся спецслужбы Беларусі і Расіі. Сама характэрным момантам спаткання стала наведванне аднаўленай мемарыяльнай сядзібы Фелікса Дзяржынскага. І зноў загучалі словы пра „выдаючэвася дзеяцеля великай эпохи". Гэта палітычнае блюзнерства найглыбейшага кшталту. Помнікі Дзяржынскаму, гэтаму крываваму людаеду, а таксама ідэйным правадырам генацыду Леніну, Сталіну стаяць у Беларусі. Бальшыня і не задумваецца, што гэтыя каменныя ідалы па шыю ў нявіннай чалавечай крыві. Нацыя, якая зусім нядаўна перажыла нямецкі фашызм і савецкі камунізм (з'явы па сутнасці і жахлівасці абсалютна аднолькавыя!), не бачыць як з усходу насоўваецца новы карычневы рэжым — рэжым нянавісці і знішчэння ўсяго хрысціянскага, нацыянальнага, чалавечага. Не хоча, ці баіцца, гэта бачыць і псеўдаліберальная Еўропа, якую нічому не навучыла гісторыя дваццатага стагоддзя.

30 кастрычніка на прасторах былой савецкай імперыі адзначаецца Дзень памяці ўсіх ахвяраў рэпрэсій. Днямі ў Маскве сабраліся вязні ГУЛАГу, каб ушанаваць 50-я ўгодкі паўстання зняволеных у Кенгірскім канцлагеры. Паехалі туды і беларусы, якія былі ўдзельнікамі таго бунту адчаю. У кожнага свая памяць. У 1988 годзе ў газеце „Літаратура і мастацтва" быў надрукаваны артыкул Зянона Пазьняка і Яўгена Шмыгалёва „Курапаты — дарога смерці", які літаральна скалануў нацыю. Пасля гэтага ў Мінску былі ўтвораныя рэспубліканскае грамадскае гісторыка-асветнае таварыства памяці ахвяр сталінізму „Мартыралёг Беларусі" і аргкамітэт Беларускага народнага фронту „Адраджэньне". Неўзабаве прайшоў мітынг-рэквіем „Дзяды", які быў гвалтоўна разагнаны сілавымі структурамі. Менавіта тады вырас свядомы арганізаваны беларускі палітычны рух, вынікам якога стала заваёва суверэнітэту. Сённяшняя беларуская ўлада аднаўляе помнікі крывавым бальшавіцкім монстрам. Таму, што такое дзеецца зараз у Расіі. А ў Курапатах паўстаў сапраўды народны крыжовы мемарыял.

Сучаснае беларускае Адраджэнне пачыналася з курапацкіх Дзядоў. Тым палітыкам, якія хочуць прэтэндаваць на агульнанацыянальнае дэмакратычнае лідэрства, варта пра тое задумацца.

Уладзімір Хільмановіч

Аб каханні і гневе

І ішлі мы ў пахмурны асенні дзень жвіровай прысадай ды спыніліся перад калюгай, у якой плаваў жоўты пяціпальчаты ліст, падобны да адсечанай далоні.

— У такую пару года, — пачаў мой знаёмы паэт-постмадэрніст, — нахлынае на мяне думка аб няўхільным заняпадзе нашай, еўрапейскай цывілізацыі, дарэчы, кожнай цывілізацыі. Жывем у час глабальнай трывогі, вычэквання таго, што немінуча здарыцца, а не спадзяемся бяспечнага быту. Стаім перад пераацэнкай усіх каштоўнасцей, беззваротна мінула эпоха класіцызму і ладу.

Я маўчаў, бо і я трапіў пад настрой змяркання. Што ж мог яму адказаць? Што ахопліваюць нас тыповыя інтэлігенцкія настроі, што, даследуючы былое што і руш натыкаемся на факты, на шкадобу за страчаным раем, за залатым векам, у якім быццам бы бытавалі нашы продкі. А гэта, проста, жаль за страчанай маладосцю, за летнімі канікуламі, якім трываць без канца. І вось паяўляюцца асобені, што абяцаюць збудаваць новую, светлую будучыню, новае, дасканалае грамадства, не азіраючыся ў мінулае, прытым лёгка і хутка, паколькі планы перабудовы трымаюць яны напагатове, пад пахай.

— У сувязі з гэтым адчуваю сябе расколатым, няўпэўненым, дрыготкім, — працягваў паэт. — Расколатым паміж патрэбай індывідуалізму, асабістай свабоды, быцця пераможцам, правадыром і героем, што пагарджае прымітыўнымі, чароднымі эмоцыямі тлуму, а патрэбай нахіліцца з любоўю і клопатам над лёсам людзей нешчаслівых, пакрыўджаных лёсам, а такіх — вялікая большасць. Спадарожнічае мне прытым скрываная боязь гневу незадаволеных масаў, якія тонкі інтэлігенцкі слоік у шалёным парыве сатруць на порах.

Я маўчаў і прыгадваў погляд Фрыдрыха Ніцшэ на крыніцы ўсялякага мастацтва, а, на ягоную думку, іх дзве, і яны процілеглыя, а б'юць яны поруч сябе. Апаланічнае мастацтва мела б выражаць настроі класіцызму, памяркоўнасці ды ладу, а дыянісійскае выражала б рамантычныя эмоцыі, разгулу, бунту і гвалту. Пісьменнік Рышард Капусцінскі ўспомніў у адным з інтэрв'ю аб адвечных тэндэнцыях у гісторыі чалавецтва — тэндэнцыі да глабалізацыі і адзінасці, супрацьстаіць якой тэндэнцыя да раздраблення і падзелу, сёння выступаючая ў форме рухаў ці то нацыяналістаў, ці антыглабалістаў, зялёных і да г.п.

Вось пытанне глыбока чалавечае, якое мусіць рашыць, жывучы, кожны з нас: у які момант застацца пры адабрэнні нашага свету, пры згодзе на тое што ёсць, на гэтую вось прыроду, на гэткія прадукты чалавечых рук ды розумаў, на такіх вось іншых людзей — такіх, якімі яны ёсць, тут і цяпер, а патрэбай змен, калі не рэвалюцыйных, то эвалюцыйных, паступовых.

Тым часам з-за хмар вызірнула сонца, святло азалаціла кроны дрэў, пацяплела і мы расшпілілі асеннія курткі.

— Усё ж, прыгожая наша залатая восень, — сказаў паэт. — У такія хвіліны, усё ж, хочацца жыць, кахаць, ствараць.

Ежы Плютовіч

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вачыма еўрапейца

Фронтам к Беларусі

Шэф дэлегацыі ЕС-Беларусь, член прадстаўніцтва польскіх назіральнікаў, еўрадэпутат Багдан Кліх (Грамадзянская платформа) падкрэсліў:

— Выбары і рэферэндум у Беларусі не павінны быць прызнанымі Еўрасаюзам за сумленныя і справядлівыя.

Выбары 17 кастрычніка (разам з — як гэта называлася — датэрміновай фарсай) і пазнейшыя дзеянні дзяржаўнай адміністрацыі, падтрымліванай службамі бяспекі, для Беларусі і міжнародных адносін з гэтай краінай шмат могуць змяніць. Толькі калі дзеянні будуць усчаты хутка, пакуль свет зноў аб Беларусі не забудзе, хоць бы пад уплывам абароны якіхсьці інтарэсаў у іншых яго закутках, як пасля прэзідэнцкіх выбараў на Украіне. Адразу пасля выбарчай нядзелі паявіліся першыя прадвесці. Прэс-інфарматарка Еўрапейскай камісіі Эма Удвін асцерагала:

— Беларусь не будзе магчы поўнасцю карыстацца еўрапейскай стратэгіяй суседства.

Азначае гэта, што не будзе яна прымаць удзелу ў шмат якіх еўрасаюзных праграмах, затым разлічваць на еўрасаюзныя фонды.

У сваю чаргу прэзідэнт Джордж Буш падпісаў закон, які дазволіць на фінансавую падтрымку апазіцыйных партый у Беларусі і адмовіўся даваць якія-небудзь крэдыты ўрадавым арганізацыям. Гэты жэст напэўна знамянальны. Калі, аднак, верыць у данясенні з Вашынгтона, гаворка ледзь аб 40 мільёнах долараў. Дэмакратыі — у апошняй дыктатарскай дзяржаве Еўропы — за такія грошы не ўдасца збудаваць.

А Польшча, згодна з заявамі прэм'ера Марка Бэлькі, надалей не мае намеру ўтрымліваць кантактаў на вышэйшым урадавым узроўні і далей будзе пераконваць апошнія краіны ЕС да „ізалявання беларускіх улад, але не беларускага народа". Краіна над Віслай — не прыхільнік поўнай ізаляцыі Беларусі, бо гэта можа яе цалкам увапхнуць у абдымкі Расіі. Затое польскі ўрад выказваецца за прызначэнне намнога большых сродкаў для беларускіх няўрадавых арганізацый і да таго без неабходнасці фінансавай долі другога боку. МЗС у Варшаве тлумачыць гэтую з'яву фактам, што выбары і рэферэндум былі „гвалтам на асноўных дэмакратычных стандартах".

Канкрэтныя заявы прагучалі з вуснаў Багдана Кліха і яго калегі з Еўрапарламента Яцка Пратасевіча. Маюць яны прапанаваць Еўрапейскай камісіі заснаванне стыпендыйнай праграмы для беларускай моладзі і асігнаванне грошай на аднаўленне дзейнасці радыёстанцыі, якая б вяшчала з Польшчы ці Літвы. Мела б быць яна створана на ўзор закрытага Радыё „Рацыя", якога, дарэчы, частотнасць засталася. Нявыключана таксама, што прагучыць заява аб адмяненні візавага рэжыму для беларусаў. Стала б гэта адначасова забаронай уезду ў еўрасаюзныя краіны асобам звязаным з рэжымам (пракурорам, суддзям, прадстаўнікам дзяржаўнай адміністрацыі і да т.п.).

Першыя дзеянні ўжо ўчыніла падляшская еўрадэпутатка, таксама назіральнік за выбарамі — праф. Барбара Кудрыцкая. У кіраванай ёю Вышэйшай школе публічнай адміністрацыі зможа бясплатна вучыцца дзесятак маладых людзей з Беларусі. З падобнымі ініцыятывамі выйшлі ўжо таксама некаторыя іншыя польскія вучэльні, м.інш. у Познані.

На дарозе да гэтага своеасаблівага звароту ў бок Беларусі сталі два польскія дэпутаты. Перш за ўсё Анджэй Лепэр:

— Не заўважыў я ніякіх правапарушэнняў, — казаў ён 17 кастрычніка ў Мінску і зараз пасля ў рэзідэнцыі прэзідэнта Лукашэнкі віншаваў яго.

Таксама анічога трывожлівага ў час выбараў не прыкмеціў падляшскі дэпутат Яўген Чыквін, адпраўлены ў Мінск маршалкам Сейма Юзафам Алексым:

— Пазітыўна мяне захапіла, што слова Беларусь — галоўны элемент у гэтай кампаніі. Усё, што мы бачылі ў выбарчых участках — у межах прынятых стандартаў.

Наколькі паводзіны дэпутата Лепэра не здзіўляюць (ужо да такіх прывычыў і ніхто іх не трактуе ўсур'ёз), то цытаты з дэпутата Чыквіна прыведзеныя расійскім агенцтвам Інтэрфакс — пагрозлівыя. Пагрозлівыя перш за ўсё для беларусаў і іншых меншасцей у Польшчы.

Мацей Халадоўскі

На поўным люзе

Ёзік Д. не баіцца ні смерці, ні пекла.

— Што ўсім — тое і мне, — кажа.

— Ну так, — бяру хрысціянскую ноту — а як прымусяць у пекле вазіць дзень і ноч смалу ў бочцы? (сёння ў царкве бацюшка страшыў алкаголікаў пеклам).

Ёзік Д. на момант ажыўляецца і пасылае ў паветра банальны мат.

— А, то ў пекле, — кажа гледзячы ў неакрэслены пункт, — буду мець *якуюсь* работу!

Папраўдзе, работы ў Ёзіка Д. хоць адбаўляй. Найперш яму трэба ачуняць пасля адзінаццацідзённага запою.

Нічога што на іржышчы гніе салома, а ў хляўку, дзе стаяць авечкі, заваліўся дах.

— Прабачце, што я непабрыты, — сароміцца кавалер, — а то як воўк аброс.

* * *

Напачатку ў Н. мяне ледзь не раз'ехаў п'яны трактарыст.

Сёння, 11 верасня. Свята *Галавэсека* — так у народзе на Гайнаўшчыне завуць дзень Усячэння Галавы святога Іаана Хрысціцеля. У царкве памінаюць памерлых, а ў апошнія гады — моляцца яшчэ за ахвяры тэрарызму.

— То такое вялікае свята, што нават яблык нельга сарваць, — кажа маці Ёзіка Д. — Калісь, бывала, усе ў гэты дзень шчыра пасцілі.

Бабулі сорамна за маладых. Вось у Валодзькавых уключылі на ўсю моц магнітафон і скачуць быццам чэрці перад хмарамі. Мусіць, на пагібель, — ці як?!

Ды яшчэ быццам падкуплены, усёй шырынёй вуліцы, значыць, ад плота да плота, едзе на ровары паўпрытомны халасцяк Міцік. Зваліўся перад фортачкай, ледзь устаў ды патрапіў у браму.

— О-го-го! — балюча моршчыць бровы бабуля. Зараз у Цімкавых *бананза* пачнецца.

— Якая яшчэ бананза?

— Найперш падзяруцца сын з маці, пасля ён будзе вешацца, а яна вішчаць на ўсю вёску.

Калі ў Цімкавых праз божую ноч вешаюцца і вішчаць — у Валодзькавых рагочуць і падкручваюць магнітафон.

* * *

Папярэднюю ноч таксама не спалі ў Н. Пасля другіх пеўняў пачалі брахаць сабакі. Раніцай — гвалт! Бо ў Максімкавых ваўкі з'елі цялушку. На пасавым, дзвесце метраў за вёскай. Ідзе гаспадыня раніцай, а там адны ногі і галава валяюцца.

— А ў Макаўцы то каня ўвінцілі!

— Хто?

— Ваўкі.

Гляджу на павалены Ёзікаў хлеў і ўжо ўяўляю як ваўкі раздзіраюць ягоных авечак.

— А ці сусед у вас хоць не злосны? — мяняю тэму.

— А каб ён здох! — хвалюецца старэча. — Як у нас бяда — то ў яго вяселле!

Не здзіўляюся. З панадворка толькі што сустрэтага дзеда Ахрэма далятае агрэсіўная балбатня. Як з пекла. Пенсіянер співаецца дэнатуратам і дзень у дзень катуе карову або жонку. Бедная кабеціна сядзіць у акне і непрытомным зрокам узіраецца на вуліцу.

— Сядзіць так і чаруе, — хвалюецца маці Ёзіка Д. Паводле апошняй, гэта суседка „штось" зрабіла яе сыну.

У балбатуна-дэнатуршчыка няма прыбытку ад магіі. Наадварот. Панадворак зарос лапухамі і крапівой. Здзічэлы сад апанавала зараза. Ды нехта пад псеўданімам „Колька Дзындзык" украў бензапілку і прадаў яе ў Галяковай Шыі.

— Паліцыя і тая перастала намі цікавіцца, — нарае Ёзік Д. — Асталіся на поўным *люзі!*

* * *

Ёзік Д. таксама співаецца дэнатуратам. Каб хутчэй *кепнуць*.

— Як добра, што я нежанаты, — кажа без упэўненасці. Пасля праз некалькі хвілін уяўляе горкі лёс сваёй уяўнай жонкі і такіх жа дзетак.

— Як бы, напрыклад, сказалі: тату, дайце на цукеркі? А я без граша... То што мне рабіць? Ісці красці? О — не! Лепш не жаніцца! Ці ў школу клічуць... А ў мяне нават чаравікаў няма.

Ёзік Д. уяўляе як павінен паводзіць сябе сапраўдны бацька школьніка.

— Я б пад'ехаў пад школу якой *таётай*, пад гальштукам, каб не думалі што апошні...

Сапраўды, кантраст паміж марамі і рэальным жыццём Ёзіка Д. — як між простым і электрычным крэсламі.

Замест „таёты" ў халасцяка-земляроба паабіваны рускі ровар „Украіна". На нагах — чобаты-гумоўцы. Залоены шведрык і такія ж штонікі. Няма пярэдніх зубоў. Ёзік Д. не думае пра пратэз.

— Няма за што ўставіць зубоў, — кажа.

— То ж табе належыцца дарма, — папракаю хлопца. — Хлапец без зубоў — як дуб без жалудоў!

— Як няма за што ў Гайнаўку з'ездзіць, — пачынае ад пачатку Ёзік Д.

З суседавага панадворка зноў чуецца балбатанне.

* * *

У Н. балюча пабываць нават гадзіну.

— То нават дзеці і ўнукі перасталі прыязджаць, — наракае маці Ёзіка Д. А пасля паворчвае ката хвастом:

— А ну іх! — кажа пра сваіх родных. — Хай сядзяць у тых галубятніках і валяюцца ў карыце (у Н. галубятнікам завуць кватэру ў блёку, карыта — ванна).

Бабуля апавядае як у час вайны немцы расстралялі яе бацьку і як гаравала па людзях з матуляй і сёстрамі. Замужам таксама не зажыла шчасця. Муж біў і п'янствавaў, а пасля памёр без пары. Сёння пакутуе з-за сына-алкаголіка.

— Найгорш калі ён пойдзе ў „рэйс", значыць, у запой, на тыдзень, або і два. А я сяджу і думаю. Думаю — чаму так? Чаму ў іншых людзей дзеці як дзеці? Тады так сумна на душы, так баліць у грудзях. Ці я — думаю сабе — у свеце ўжо апошняя?

Апошні сон, які прыдаўся ў ноч на *Галавасека*, адабраў апошнія сілы. Прыснілася іх вуліца. Замест бруку плыла мутная, успененая рэчка. Дом чамусьці пахіліўся да вады. Здавалася, яшчэ момант і паплыве з бруднай хваляй...

Пасля ад хаты да хаты хадзілі салдаты з карабінамі і стралялі людзей. Усіх, па чарзе. Старых, малых. Над вёскай чуўся дзікі лямант, віск, стрэлы.

— А я ляжала на ложку і чакала. У нашую хату таксама прыйшоў малады салдат. Такі прыгожы. Адкрыў дзверы ў сенях, шукаў клямку ў кухню... Я не схавалася. Ляжала і чакала. Мне здавалася, што я асталася ў вёсцы адна пры жыцці. Падумала: хай заб'юць і мяне!

Ева Сцепанюк



Мал. МІРАСЛАВА ЗДРАЙКОЎСКАГА

Вандалізм

Пры камуне, калі добра гаспадарыла калектыўная гаспадарка (РСП) у Трасцянцы, яе старшыня Аляксандр Зіневіч, каб аблегчыць даезд да сенажацяў, падбудаваў быў на рэчцы Малынцы бетонны мост, а цераз сенажаць зрабіў гравійную дарогу, акопваючы паабапал равамі.

Жыхарам вёскі Бялкі было цяжка даехаць да сваіх сенажацяў і яны прывезлі цэментныя кругі (цэмбравіны) з Нарвы і ўлажылі масток. Гэтую працу грамадскім пачынам выконвалі Мікалай Ігнацюк і Васіль Міхальчук, і пасля ўсім жыхарам вёскі добра было даехаць на сваю сенажаць. Калі 12 кастрычніка г.г. Васіль Міхальчук другай сваёй дарогай загнаў кароў на сенажаць, а потым трактарам адтуль хацеў выехаць на гравійную дарогу, аказалася, што масток быў так замаскіраваны, што калі ўехаў на яго, той цалкам заваліўся. Выявілася, што нехта выцягнуў цэментныя кругі з-пад таго мастка. Спадар Васіль не мог выехаць трактарам з рова. Прыйшоў ён у вёску і папрасіў у солтыса Сцяпана Семенюка дапамогі. І солтыс паехаў выцягваць трактар з рова. Вось, даражэнькія, якія бываюць людзі. Калі яму непатрэбны масток, а спатрэбіліся цэмбравіны, дык панішчыў яго, нягледзячы на тое, што іншым сялянам ён вельмі патрэбны. Сорам такім людзям!

Мікалай Лук'янюк

У карысць шпіталя

Дырэктар шпіталя ў Бельску звярнулася з просьбай ва Управу павета ў справе выдзялення фінансавых сродкаў вартасцю ў паўмільёна злотаў на пагашэнне ўласнага ўзносу на выкананне тэрмаізаляцыі будынкаў шпіталя і куплю новага медыцынскага абсталявання ў 2004-2005 гг. Управа павета згадзілася абяспечыць суму 170 тысяч злотаў на сфінансаванне тэрмаізаляцыі будынкаў шпіталя і падвальнага праходу. Затое ж управа поўнасцю адобрыла заяўку дырэктар і згадзілася бясплатна перадаць шпіталю 120 кв. метраў тратуарных плітак ад абнаўлення вуліцы Міцкевіча. **(мм)**

Свярбелі рукі

У сямідзесятыя гады, калі рэгулявалі рэчку Малынку, якая плыве далінай праз сенажаці вёскі Бялкі, на гміннай дарозе з Бялкоў у Жыўкова пабудавалі прыгожы бетонны мост з жалезнымі балюстрадамі з абодвух бакоў, каб ніхто не ўваліўся ў рэчку. Камусь, аднак, свярбелі рукі і балюстраду, проста кажучы, украў. Па сённяшні дзень няма каму паклапаціцца аб бяспецы, пакуль не здарыцца нешчаслівы выпадак. Потым пракурор будзе шукаць віноўнікаў сярод адказных за нагляд за мастамі. Падумайце, адказныя ўлады, і зрабіце парадак на вышэйуспомненым мосце, пакуль не будзе запозна.

Мікалай Лук'янюк

У новым будынку

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Архітэктура будынка прыцягвае ўвагу наведвальнікаў (на першым плане войт Юрый Васілюк)

Ад пачатку кастрычніка чыноўнікі Гміннай управы ў Чыжах працуюць у новым будынку. Яго ўзвядзенне каштавала каля 800 тысяч злотых і выконвалася ў двух этапах. Інвестыцыю распачаў у 1995 годзе тадышні войт Рыгор Мацкевіч. На выкананне сцен і даху выдаткаваў ён каля 300 тысяч злотых і інвестыцыя спынілася да 2003 года. За апошні год цяперашні войт Юрый Васілюк на завяршэнне будовы выдаткаваў 480 тысяч злотых. Будаўнічыя работы часткова фінансаваў Кааператыўны банк у Гайнаўцы, які займае вялікую залу на першым паверсе. Некалькі пакояў будзе арандаваць паштовае аддзяленне.

Архітэктура будынка прыцягвае ўвагу наведвальнікаў. Побач уваходa — стаянкі для машын і веласіпедаў ды каляровыя тратуары. На ўчастку ля галоўнай вуліцы будзе засеяна трава. Стары калодзеж будзе перабудаваны і ўпрыгожаны. Застанецца, распаложаны збоку, драўляны будынак вясковай святліцы, у якім надалей будуць арганізавацца вялікія культурныя мерапрыемствы. Выстаўкі, сесіі Гміннай рады і невялікія сустрэчы будуць ладзіцца ў вялікай зале новага будынка. У вялікім кабінеце войта за канферэнцыйным сталом будуць адбывацца пасяджэнні камісій гміннай рады.

— Запрапанаваў я размясціць у будынку Гміннай управы банк і пошту, каб людзі на месцы маглі аформіць усе неабходныя справы, — кажа войт Юрый Васілюк. — Удзел банка ў будове паменшыў выдаткі гміннага бюджэту.

Асобную, вялікую залу займае гмінная бібліятэка. Сярод кніжак — крыху экземпляраў на беларускай мове. На паліцах — творы беларускіх класікаў. На падлозе — каляровыя палавікі, а на стэлажах — прыгожыя макаткі вытканыя чыжоўскімі рукадзельніцамі. Бібліятэчныя камп'ютэры пастаянна падключаныя да Інтэрнэту. Войт плануе ўключыць іх у тэлеінфарматычную сетку. Прадбачваецца таксама стварэнне гміннага цэнтра інфармацыі з кіёскам, у якім можна будзе даведацца аб рынку працы. За камп'ютэрам спатыкаем кіраўніка Гміннага асяродка культуры Юрыя Якімюка — арганізатара шматлікіх культурных мерапрыемстваў у летні перыяд. Нядаўна паявіліся інфармацыйныя дошкі каля гістарычных аб'ектаў. Гмінныя ўлады плануюць актывізаваць турыстычную і агратурыстычную дзейнасць.

У гміне рэалізаваліся, таксама, іншыя інвестыцыі. За павятовыя і гмінныя сродкі дакончылі смалаваць, з выкарыстаннем грэсу, дарогу Чыжы — Падрэчаны. За гмінныя грошы закончылі смалаваць дарогу Лушчы — Курашава і мадэрнізавалі дарогу ў Вульцы. Грошы выдаткоўваліся на рамонт школьнага будынка ў Чыжах і выкананне асвятлення пры дарозе паміж аўтазапраўкай, распаложанай побач Збуча, і самой вёскай.

Самай вялікай гміннай інвестыцыяй будзе будова ачышчальні сцёкаў і каналізацыі ў частцы вёскі Чыжы. Ужо падрыхтаваны праект і ў наступным годзе распачнецца рэалізацыя інвестыцыі. Войт Юрый Васілюк паінфармаваў, што 85% коштаў будовы ачышчальні сцёкаў (уся інвестыцыя будзе каштаваць 3,5 мільёна злотых) будзе фінансаваных Інтэграванай аперацыйнай праграмай рэгіянальнага развіцця.

Аляксей Мароз

Заслужаныя для аховы здароўя

Урачыстай здачы ў карыстанне новаадрамантаванага хірургічнага аддзялення і кабінета эндаскапіі Самастойнага публічнага комплексу аховы здароўя ў Гайнаўцы спадарожнічала ўручэнне медработнікам ганаровых адзнак „За заслугі для аховы здароўя".

Ужо восем гадоў гайнаўская бальніца дзейнічае ў новым будынку. Зараз у ёй 13 аддзяленняў і 370 ложкаў. Пасля рамонту ўзнікла зала пасляаперацыйнага нагляду, абсталяваная новымі прыладамі. А новаадрамантаваны кабінет эндаскапіі адпавядае еўрасаюзным патрабаванням.

Епіскап Гайнаўскі Міран і каталіцкі ксёндз Марэк Ляшук маліліся за хворых, працаўнікоў бальніцы і асвяцілі адрамантаваныя памяшканні.

— Цудоўна, калі бачым усмешку на тварах хворых, — заявіў епіскап Міран. Уручыў ён усім хворым хірургічнага аддзялення іконкі і жадаў хутка вяртацца да здароўя.

Ганаровыя адзнакі „За заслугі для аховы здароўя" атрымалі з рук віцэ-ваяводы Ежы Паўяновіча шэсць працаўнікоў — шматгадовы хірург і былы ардынатар гайнаўскай бальніцы Уладзімір Манцюк, лекар першага кантакту Валянціна Сасна-Зіневіч, спецыяліст па справах абароннасці, бяспечнасці і гігіены працы Віктар Бура, медсястра са станцыі дыялізаў Яўгенія Негярэвіч, пенсіянерка Люцына Шпаковіч і кіраўнік аддзялення харчавання Марыя Стэльмах.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Віктар Бура (першы справа) сваю прафесійную работу распачаў у 1962 годзе ў Павятовай станцыі хуткай дапамогі ў Гайнаўцы, як санітар. З 1977 года працаваў у гайнаўскай бальніцы на пасадзе рэферэнта, а пасля інспектара і спецыяліста па справах бяспечнасці і гігіены працы, абароннасці і супрацьпажарнай аховы. Год назад Віктар Бура перайшоў на пенсію, але надалей працягвае займацца справамі абароннасці ў Самастойным публічным комплексе аховы здароўя ў Гайнаўцы. Віктар Бура дзейнічае ў БГКТ і іншых арганізацыях. За сваю прафесійную і грамадскую работу атрымаў многа ўзнагарод. Найважнейшыя сярод іх гэта Залаты крыж заслугі, Залатая адзнака Цэнтральнага саюза жыллёвых будаўнічых кааператываў і адзнакі „Заслужаны дзеяч культуры" і „Заслужаны дзеяч грамадскага руху".

Спадар Віктар Бура ў час сваёй звышсаракагадовай работы быў працаўніком незвычайна сумленным і абавязковым. Умеласць уласцівай арганізацыі работы дала яму магчымасць перфекцыйнага выконвання ўсіх задач, спалучаных з дзейнасцю камісіі бяспечнасці і гігіены працы. Шматлікія кантролі паказалі ўзорную гаспадарку прыладамі цывільнай абароны, якімі ён займаўся, — дала ацэнку дырэкцыя Самастойнага публічнага комплексу аховы здароўя ў Гайнаўцы.

(ам-з)

ЕГУ ў выгнанні

У ліпені г.г. Еўрапейскі гуманітарны універсітэт у Мінску, пасля дзесяці гадоў існавання, быў пазбаўлены ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць. Афіцыйнае тлумачэнне прычын закрыцця недзяржаўнай вышэйшай навучальнай установы ўказвала на скасаванне дамовы на арэнду памяшканняў для вучэбнага працэсу. Аднак пазней, 23 верасня, выступаючы перад студэнтамі ў Брэсце, прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка раскрыў сапраўдныя — палітычныя — матывы гэтага рашэння. „Сваю эліту, будучае кіраўніцтва краіны, — сказаў ён, — мы будзем рыхтаваць самі, у беларускіх ВНУ, у тым ліку рэгіянальных". Паводле прамоўцы, рыхтаваная ў ЕГУ эліта мела з часам „прывесці Беларусь на Захад", а гэта для цяперашняга кіраўніцтва Беларусі справа непрымальная.

Фота МІРАСЛАВЫ ЛУКШЫ

Супрацоўнікі Філасофскага факультэта ЕГУ ў рэдакцыі „Нівы". Злева: праф. Рыгор Мінянкоў, дац. Тацяна Шчытцова, дац. Вольга Шпарага і аспірант Аляксандр Адамянц.

Дзяржаўныя ўлады запрапанавалі студэнтам ЕГУ перавод на навуку ў іншыя ВНУ краіны. Прапановай пакарысталася большая частка студэнтаў (семсот чалавек перайшло ў БДУ і іншыя ўстановы). Улады робяць выгляд, што далі ім магчымасць вучыцца ў лепшых ВНУ краіны. Аднак трэцяя частка студэнтаў адмовілася ад дзяржаўных навучальных устаноў, а выкладчыкі раз'ехаліся па свеце ў пошуках дапамогі студэнтам і універсітэту.

Пад канец верасня ў Беластоку пабывалі навуковыя супрацоўнікі Філасофскага факультэта ЕГУ, на чале з яго дэканам, прафесарам Рыгорам Мінянковым. Правялі яны размовы з прадстаўнікамі беластоцкіх вышэйшых навучальных устаноў, а пры нагодзе наведалі нашу рэдакцыю.

Прафесар Рыгор Мінянкоў расказаў аб праекце віртуальнага універсітэта, паколькі сітуацыя ў Беларусі пагаршаецца і для такога універсітэта не будзе ў ёй месца. Офіс ЕГУ будзе адкрыты ў Вільні. Ужо шмат навуковых цэнтраў запрапанавала беларускім студэнтам месцы і стыпендыі. Універсітэт Вядрына ў Франкфурце-на-Одры прызначыў 50 стыпендый для студэнтаў пятага курса. Ніжэйшы кошт навукі для беларусаў запрапанаваў Смольны коледж у Санкт-Пецярбургу. Пяць месцаў адвялі студэнтам польскія недзяржаўныя універсітэты, а Польская акадэмія навук запрасіла беларусаў працягваць навуку па магістэрскіх і аспіранцкіх праграмах Цэнтра сацыяльных даследаванняў Інстытута філасофіі і сацыялогіі. Вышэйшая школа публічнай адміністрацыі ў Беластоку запросіць на навуку дзесяць студэнтаў, а Беластоцкі універсітэт рашэнне ў гэтай справе прыме неўзабаве. Дзевятнаццаць студэнтаў, якія знаходзіліся ў ЗША па праграме Work & Travel, атрымалі магчымасць правучыцца на працягу аднаго года ў амерыканскіх коледжах. Магчымасць працягвання навукі беларускім студэнтам стварае Амерыканскі універсітэт у Балгарыі, вучэльні Чэхіі ды Ірландыі.

Пошукі магчымасцей заканчэння навукі для студэнтаў працягваюцца. З гэтай мэтай у палове кастрычніка пабываў у Варшаве рэктар ЕГУ праф. Анатоль Міхайлаў. Ад польскіх партнёраў пачуў ён, што вырашэнне гэтай праблемы патрабуе інстытуцыянальных вырашэнняў і што такія ініцыятывы ўжо нараджаюцца.

Віталь Луба

Абрадавыя калектывы

Калі закончыліся беларускія народныя фэсты ў паасобных мясцовасцях Беласточчыны, Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства прыступіла да ладжання ў Беластоку выступленняў мастацкіх калектываў, у рэпертуары якіх маюцца беларускія народныя абрады. Запрошаныя ў Беласток калектывы ўдзельнічалі ў сёлетнім XI Цэнтральным аглядзе беларускіх народных абрадаў у Гарадку, які прыцягнуў дваццаць гуртоў.

Калектыў з Залук на сцэне

Вечарам 9 кастрычніка зала ГП БГКТ запоўнілася жыхарамі горада. Сабраных сардэчна прывітаў старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі. Прамоўца адзначыў важнасць папулярызацыі багацця і прыгажосці беларускіх народных абрадаў.

На сцэне БГКТ выступілі чатыры мастацкія калектывы. Самадзейнікі з вёскі Залукі, што ў Гарадоцкай гміне, пад кірункам Валянціны Паплаўскай падрыхтавалі велікодны абрад „Канапелькі". На першы, альбо на другі дзень Вялікадня (залежыць ад мясцовасці) спяваючыя групы ходзяць ад хаты да хаты, стукаюць у вокны і просяць гаспадароў дазволу славіць песняй Хрыста. А для дзяўчат спяваецца песня „Канапелька". Спевакоў узнагароджваюць яйкамі, каўбасамі, а нават гарэлкаю. Добра паказалі сябе на сцэне залучане. Да макета вясковых хат падышлі валакальнікі і пастукалі ў вокны. У акне з'явілася гаспадыня, якая дала згоду на спяванне пасхальнай песні і „Канапелькі" для дачкі-паненкі. Валачобнікі за дзве песні атрымалі ўзнагароду. Залучане прыгожа праспявалі яшчэ некалькі песень. Іх маладзёжная група таксама добра справілася з велікодным абрадам.

Затым сцэнай авалодаў Гарадок. Выступілі тры калектывы. Гімназісты пад мастацкім кіраўніцтвам настаўніцы Ніны Налівайка падрыхтавалі абрад таксама звязаны з Вялікаднем. Хваліць іх трэба за тое, што падрастаючае пакаленне праяўляе зацікаўленне да сваіх абрадаў і традыцыі.

Калектыў „Асенні ліст" прадставіў навагодні абрад „Шчодры вечар", падрыхтаваны Тамарай Сянкевіч. Дзяўчаты на сцэне займаліся варажбой, гадалі, каторая з іх першай выйдзе замуж. З воску вылівалі фігуркі, устаўлялі туфель за туфлем, пускалі жывую курыцу, якая збірала зярняты збожжа. Пры гэтым спявалі калядкі і народныя песні.

Калектыў „Расспяваны Гарадок" пад мастацкім кіраўніцтвам Ніны Цыванюк падрыхтаваў сцэнку яе аўтарства „Бяленне палатна", якая паказвае цяжкую працу вясковых жанчын. На сцэне жанчыны разаслалі палотны і перажылі смешную прыгоду з п'яніцай, які перашкаджаў ім працаваць.

Заключным пунктам выступленняў у гэты вечар была сімуляваная тэлефонная размова Ніны Цыванюк з блізкай асобай аб дзяржаўным дзеячу-няўдачніку.

Усе выступленні выконваліся высока па-мастацку. Падабаліся яны беластачанам і таму ўзнагароджваліся працяглымі апладысментамі.

Сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч сардэчна падзякавала ўсім самадзейнікам і іх мастацкім кіраўнікам і запрасіла прысутных на чарговы вечар з беларускімі народнымі абрадамі.

Міхась Хмялеўскі

Скоразнікаючыя кавярні

У Гайнаўцы, як горад горадам, былі кавярні. Адна, якая ўсім найбольш запамяталася, гэта „Верас" па вул. Краёвай Арміі, другая — у Доме настаўніка па вул. Пілсудскага. Яны бурлілі жыццём. Было дзе зайсці ды прыемна правесці свабодны час.

Апошнім часам новаадкрытыя кавярні хутка, быццам эфемерыды, знікалі з гарадскога пейзажу. Былі дзе кавярні пры вуліцы 3 Мая. Адну неўзабаве закрылі, а вось другую раскінулі, знеслі ўвогуле з паверхні зямлі 14 кастрычніка г.г. Чаму яны ў такой няласцы? Мо цяпер вядзенне іх нікому не аплачваецца? Гэтак жа знікалі малочныя бары.

Ходзячы вуліцамі Гайнаўкі ўдалося мне знайсці кавярню. Адну, невялікую, адкрылі толькі што недалёка ад Комплексу прафесійных школ ды ля скрыжавання з кругавым рухам вуліц: 3 Мая, Белавежскай, Верабея і Варшаўскай. Яна працуе кожны дзень ад 13 да 22 гадзіны. Мо не будзе чарговай эфемернай? **(мох)**

У „Радыё Швецыя" па-беларуску

„Радыё Швецыя" — служба замежнага вяшчання шведскага радыё — вяшчае на 9 замежных мовах, а таксама на шведскай.

Беларуская праграма „Радыё Швецыя" будзе знаёміць беларускага слухача са Швецыяй — яе гісторыяй і сучаснасцю, а таксама асвятляць культурныя, палітычныя і грамадскія падзеі ў галіне шведска-беларускіх адносін.

Праграма (30 хвілін) выходзіць у эфір на кароткіх хвалях кожную другую нядзелю ў 18 гадзін па Грынвічу з паўторам у 19^{30}. Першая праграма выйдзе ў эфір 7 лістапада.

Час (па Грынвічу) і хвалі:
18^{00} — 18^{30} КХ 5830 (49м)
19^{30} — 20^{00} КХ 5830 (49)

Восень у Міхалове

Чакаючы аўтобуса на прыпынку ў Міхалове, прайшоўся я па парку. Прыпомніліся мне мае школьныя гады. У маі 1935 года, у дзень пахавання Юзафа Пілсудскага, мы, вучні пятага класа падставовай школы, пасадзілі ў парку два дубы і ўстанавілі крыж у гонар „Дзядка".

Калісь гэтага парку не было, а толькі рынак. Сяляне з наваколля з'язджаліся ў Міхалова кожны чацвер. Цяпер таксама збіраецца многа народу, бо з прыпынка можна даехаць у Беласток, Гайнаўку, Гарадок і Ялоўку. Але гмінныя ўлады не здагадаліся, каб паставіць публічны туалет. Не памятаюць таксама аб прыбіранні парку. Валяюцца ў ім банкі з-пад піва, кардонкі з-пад кактэйляў і іншае смецце. Ці ж гміне гэта не сорам?

Дзядзька Захар

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Першакласнікі і іх настаўнікі — дырэктар Гражына Куклік (першая справа) і Іаанна Якубовіч

У Бабіках на Сакольшчыне

— Добры дзень! Добры дзень! — вітаюць наймалодшыя навучэнцы ў Пачатковай школе ў Бабіках. Кожны чацвёрты вучань вывучае тут беларускую мову.

У першым класе дзеці пазнаюць літаркі. Пасля па чарзе падыходзяць да дошкі і пішуць словы: мама, рама, зорка...

— Ці ведаеце, што значыць слова „зорка"?

— Ведаем, ведаем!

Але пра нашу старонку чуюць першы раз. Тут і знаёмімся з нашай газетай. На цэнтральным здымку — вясёлыя першакласнікі з Беластока.

— To oni też uczą się po białorusku, — здзіўляюцца нашы сябры.

Пасля пойдзем у этнаграфічны куточк, у якім прэзентуюцца вышываныя ручнікі і вялізныя кросны ды зробім памятны здымак.

— І мы таксама будзем у „Зорцы"? — пытаюць дзеткі.

У чацвёртым класе

Дзеці ўжо ўмеюць расказаць пра сябе. Трэба дадаць, што вымаўленне ў іх чысценькае, прыгожае:

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

На ўроку ў чацвёртым класе

— Мяне завуць Павел Вароніч, — прадстаўляецца хлапчук з першай парты. — Я жыву ў вёсцы Мінкаўцы. Мне дзесяць гадоў.

— А мяне завуць Клаўдзія Садкоўская. Я жыву ў Вайноўцах. Мне таксама дзесяць гадоў.

Ёсць і смешныя рэчы. У адным сшытку бачу подпіс прадмета: „biało ruski".

Настаўніца выпраўляе памылку.

— А колькі радасці ў класе, калі настаўніца чытае казку! Бо хоць дзеткі размаўляюць між сабой па-польску, добра разумеюць па-беларуску. Слухаюць па радыё беларускія песні, аглядаюць беларускія тэлеперадачы. Вось на папярэднім уроку пазнаёміліся з „Курачкай рабкай", а сёння спадарыня Іаанна прачытала ім „Зайздроснага дзядзьку".

— Дзядзька, дзядзька, — паўтараць, хіхікаючы свойскае слова нашы сябры.

І хоць урокі тут першы год, яны хуценька рашылі крыжаванку ў „Зорцы". Найбольш адказаў прыдумаў Дарэк Бародзіч з Сухініч.

На памятку дзеці атрымалі „Зорку" (іншую, чым першакласнікі).

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Настаўніца Іаанна Якубовіч са сваім партрэтам

— Oni też z czwartej klasy! — здзівіліся дзеці, калі пабачылі на вялікім здымку сваіх аднагодкаў з Бельска-Падляшскага. Гэты горад ім ужо не чужы. Адтуль родам іх настаўніца, спадарыня Іаанна.

Зорка

Лунніік ажываючы

Беларусь калісьці называлі краінай замкаў.

Непадалёк ад нашых мясцінаў таксама стаяў вялікі замак. У той час, пра які я хачу распавесці, княжыў у ім вельмі багаты валадар. Каб ад багацця залежаў розум і дабрыня, не было б на свеце лепшага чалавека. Але, на жаль, золата не робіць розум бліскучым, а сэрца — залатым. Не любіў князь нікога і нічога ў свеце, акрамя грошай. Ён не жаніўся, таму што баяўся, што жонка і будучыя дзеці растрацяць яго скарбы. Адзіны пляменнік, шчыры юнак, які, асірацеўшы, папрасіў у дзядзькі прытулку, таямніча знік, і казалі, апынуўся ў замкавых скляпеннях — вязня ўтрымліваць танней, чым княжыча.

Уладны скнара не заводзіў сяброў, каб не пазычалі, не збіраў балі — бо гэта ж марнаванне дабра. Княжацкі замак абыходзілі вандроўныя музыкі і жабракі, нават паломнікі па святых мясцінах, даць прытулак якім — абавязак кожнага гаспадара.

І калі пачалася вайна і кароль загадаў сваім рыцарам збіраць войска, князь пашкадаваў траціць на ўзбраенне вялікага атрада. Сам ён не ваяваў, бо быў кульгавы ад нараджэння. Можа быць, ад тае кульгавасці вырас ён злосным, падазроным — не ведаю.

Але як ні ашчаджаў князь свае грошы, яны нібыта раставалі. Кароль угневаўся на скупечу і адабраў частку земляў. Згалелыя сяляне плацілі ўсё менш і менш падаткаў, дый разбягаліся ў пошуках лепшае долі цэлымі вёскамі.

Князю хапіла б назапашанага, каб раскашавацца да канца жыцця. Але ад няўдач ён зусім ашалеў, і за кожны шэлег гатовы быў перагрызці горла, і ўсё яму здавалася, што яго абкрадаюць, што вакол — зладзеі. Ён нават загадаў паставіць свой ложак у сутарэнні, на скрыні з дукатамі.

Неяк наладзіць заняпалую гаспадарку, пабудаваць які завод ці заняцца гандлем князю і ў галаву не прыходзіла. Золата мусіла само насыпацца ў рукі, і няма рана. Пачаў марыць пра скарбы. Адшукаў у замку старыя кнігі пра чарадзействы, распытваў слуг — ці не чулі пра закапанае багацце, пра нейкія таямнічыя разваліны ці курганы, у якіх пахаваныя каралі.

Урэшце адна старэнькая кабета, трасучыся ад страху — бо гаспадара баяліся болей, чым смерці, — прызналася, што дзяўчынкай жывучы ў вёсцы, чула пра цудадзейны корань, які нагадвае формай чалавечую постаць і крычыць, калі яго выкопваеш. Корань той валодае моцай паказваць закапаныя скарбы.

(працяг будзе)

Людміла Рублеўская

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вучні Падставовай школы н-р 2 у Гайнаўцы з Алінай Якімюк, Наталляй Герасімюк і Агнешкай Ціханюк

Як адпачывалі...

У Беларускім музеі ў Гайнаўцы сустрэў я вучняў Падставовай школы н-р 2 з настаўніцай Алінай Якімюк. З дапамогай Агнешкі Ціханюк рыхтавалі яны фотавыстаўку.

— Яшчэ ў мінулым школьным годзе ад дзяцей выйшла ідэя сабраць здымкі з канікулаў і зрабіць выстаўку пра летні адпачынак, — сказала бібліятэкарка Наталля Герасімюк.

Вучні, якія вучацца беларускай мове, прыходзяць у музейную бібліятэку за беларускімі кніжкамі. Ахвотна бяруць вершы і казкі. Гутараць з бібліятэкаркай пра беларускую літаратуру.

На выстаўцы „Мінула лета" многа каляровых фатаграфій. Кожны вучань прынёс па некалькі здымкаў. Наталля Савіцкая ў час канікулаў памагала ў сельскагаспадарчых працах у Пасталове і Ліпінах. Юстына Трашчотка летам у Варшаве наведала заапарк, Палац культуры і навукі, ездзіла на рухомай лесвіцы. Іна Кавальская бачыла прыгожыя горы і лясную звярыну. Гося Ляўчук адпачывала на Балтыйскім моры. Тамаш Леанюк быў у Дубічах-Царкоўных, ездзіў на кані і сядзеў на пажарнай машыне. Рафал Васілюк на Мазурах знаёміўся з азёрамі. Марцін Маркевіч ездзіў у Нямеччыну.

Аляксей Мароз

Хоць плач...

Выдатны дзень, цудоўны дзень!
У лесе нават таньчыць пень.
І ў бомы сонца звоніць, —
Я нарадзіўся сёння!

Мне крыкнуць хочацца „Гэй-Гэй!..."
Бацькі ж паклікалі гасцей.
А госці ў розных клунках
Нанеслі падарункаў.

Тут карабель і самакат,
Машыны, мячык, аўтамат.
Канструктар і касеты.
Свісток і ў цырк білеты.

І шмат яшчэ тут усяго.
Няма вось толькі аднаго.
Няма... Няма... Хоць плач ты:
Маленькага... сабачкі

Ігар Сідарук

* * *

Прыйшло лета прастуджанае,
бярозавым лістом атуленае.
Кіхае, прыхае,
з носам заткнёным.
Усе дзеці засмучаныя;
летам яны загарэлыя —
гэта салярый зрабіў сваё.

Юліта Вярбіцкая, Нараўка

Час рыцараў

Свята ў горадзе

Будзённы дзень у сярэднявечным горадзе звычайна быў манатонны і шэры. Аднак, калі прыходзіла свята, людзі кідалі ўсе заняткі і гулялі да ўпаду.

Вуліцамі прахаджваліся каляровыя карагоды. На кожным кроку можна было пабачыць чарадзейныя штуковіны аматараў магіі. Часта сярод натоўпу танцавалі мядзведзі. Выступалі таксама барды, якія славілі адвагу рыцараў, або скамарохі — вандроўныя акцёры.

Сваё свята мелі студэнты, якія ў час г.зв. *ювеналіяў* пераймалі ўладу ў горадзе. Тады ўволю маглі жартаваць з багацеяў, біскупа і караля.

У сярэднявечным календары было шмат святаў. Нагодай для гульні мог быць таксама шлюб князя, народзіны ягонага нашчадка, або шчаслівае заканчэнне вайны.

Любімым месцам для сустрэч былі карчмы. Ля суседніх сталоў сустракаліся рамеснікі, халопы, клірыкі, купцы або жабракі. У карчме чожна было пагуляць „у косці", з'есці гарачую страву, напіцца піва або паслухаць навінаў са свету.

(працяг будзе)

Зорка

Польска-беларуская крыжаванка № 44

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 40: Шлях, башлык, мак, ой, шанс, авёс, каштан, кок, канчатак. Башмак, рака, шок, нітка, клас, нос, школа, вінт, халасцяк.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Аня Раманюк, Наталля Каўшук, Юстына Аўласюк, Наталля Эльвіра Ялоза, Аляксандра Вікторыя Айдана, Павел Якімюк** з Гайнаўкі, **Павел Чурак, Паўліна Чурак** з Арэшкава, **Дар'юш Бароўскі, Клаўдзія Садкоўская** з Бабік, **Марта Каліноўская, Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!

„Кленікі — повстало од назвы «келіа»...”

— Клебанія тутай, о. Той кусок од цэрквы до часувонькі то-то Клебаншчына. Далей быў Кунэць, а яшчэ далей — Загад. То клебаншчына як забаву зробіт, то з кунчанамі б'ются. І з другімі вёскамі, таксама. Попрыйіжджают з усюль. Вэліка вёска, дужо молодёжы было, то і біліся. З нэкоторымі была згода, скажэм, гулялі разом, танчылі, гарэлку пілі, а з іннымі нэ любіліся. На вэсілях так самэ біліся. Бо деўчыну один возьмэ, а другі любіў. І з родзіны на родзіну, і з покаління на покаліннe пэрэходіла злуость. Всяк было.

Час гульні і час працы

Частку нашых маладых „даследчыкаў” здзіўляе выразнае размежаванне часу ў далёкай мінуўшчыне. Быў час абавязкаў, быў і час гульні, аднак прапорцыі вызначаліся даволі жорстка. Забаву на вёсцы можна лічыць нешматлікімі хвілінамі, калі дазвалялася адпачыць, забыцца на манатонію штодзённых абавязкаў. І яшчэ простае падспеўванне вечарам „на лавачках”. Прынамсі такі вобраз вылузваецца нам сёння, з-пад тоўстай шкуры шматлікіх расказаў „пра ўсё”.

Лавачкі, хай сабе не тыя, што памятаюць даваенны час, усё-такі на вёсках асталіся. І сёння можам прысесці ў цяні, паслухаць аповед Каці Леанюк, паглыбіцца ў яе маладосць. У словах пані Каці жаль за ўсе складанасці даваеннага жыцця пераклікаецца з сантыментам да гадоў маладосці.

— Ой, Божэ, Божэ. Што тэпэр жыце то нэ колісь, то вядомо, але колісь таксама было цікава. Вэчарамі то выходіла молодёж, а співают! Наробішся, а і так хочэтся выйті побачыті. І выйті то нэ всё, оно хочэтсе поспіваті. Колісь горло трэба было дэрті, якаясь такая мода была, чы дурная, чы хто яе ведае, як тое прыделіті? Тэпэрка коб так заспіваў, то сказалі бы мусіт, што вона напілася, дурная якаясь.

Шчэ і зараз, здаецца, коб спотканіся ўвэчэры, так і заспівалі б. А чом жэ не? Але дэсь позабывалі вжэ всё. Сядэм у вэчэры на кладочці, згадуем, згадуем колісьні песні, такое дэ што колісьне. Але вжэ нэ помнім. Пара слоў зганэмо, а больш нэ помнім. Ай, прожылі вжэ только лет. Я вжэ 74 года маю”.

Нэ жыце, а рай быў

Яшчэ больш „гаварлівая” жыхарка вёскі Сапава. Яе расказ можна лічыць сапраўдным маніфестам радасці ад жыцця маладога чалавека, таму варта на хвіліну прыпыніцца побач з яе лавачкай.

— Вы знаетэ, што тутай самыя гулі былі. Тут як я прышла, то нават дэўчынята наймалі музыканта і ходілі. Ігры, песні, спевы, што тут робілося, то я кажу, нэ трэба было нават іті на уліцу, у хаті было чуті як песні лешчалі. Збіраліся з околіціоў, з пэтнаццаті вёсак прыіжджалі як оно зналі што забава. Другі тыждэнь прыходіт, ужэ хлопці музыканта наймают. І так кругом. Раз дэўчынята, а другі раз хлопці. І балявалі. Дэўчынята обід рыхтуют, закуску, а хлопці, вядомо, прынэсут паўлітра.

Або, скажам вэсілье такое. Божэ, як пан молоды по рубашку прыезджае, то ўсіэ збіраюцца. Паненкі, хлопці — одводят ёго. Бо ўжэ нэ будэ ён каваліэр, а жонаты. І госцюют до поўночы. А молодая кошулю шыкуе, белізну, шкарпэткі.

Але як я ішла замуж, то ўжэ было ўсё купнэ. А як побіраліся тэсць з тэсцёвою — было ўсё льнянэ. І нагавіці, і кошуля.

Ой, вэсілье. Скажэм, як сундук прывэзут. Назбіраецца люды, пэрэбірут за молодых хлопа і бабу, на сундук посадят. І выкупляй. Нэ дасі літра і вандліну, з воза нэ зыдзеш.

Файно было. У шэсцьдзесят другім, як сюды прыехала — бо я сама спод Нарвы — то кажу вам, нэ жыце было, а рай. А зараз? Поўмірало ўсё, або пэрэд тэлевізором сэдіт. Сусід сусіда не знае.

Слухаючы такія гісторыі, хочацца на адну хвіліну апынуцца ў колішняй вёсцы, пабыць на вяселлі, ці на танцах. Але час не стаіць у адным месцы. Хаця зараз мабыць такое не ўяўляецца. Наўкол лета, вакацыі. Сняданак. Гутаркі з мясцовымі. Абед. Студэнцкі вечар, што нябачна задаўжаецца ў ноч.

— Колісь собіраліся, на вэчоркі, з дэсэць асоб да адной хаты і смеютса, одны в карты грают, другія говорат. Колісь прыказка такая была: „старыкі говорат про быкі, а молодзёж про деўкі”. І то праўда, так і говорылі.

Здзіўляе прысутнасць вайны

Дзед Рыгор Якімюк з Кожына ўсміхаецца нам і сваім успамінам. Яму каля 100 гадоў, але нават тое, што крыху глухаваты, з чаго сам зараз жартуе, не перашкаджае яму заслухацца ў далёкую мінуўшчыну, зазірнуць у няўрымслівую маладосць.

— У вайну цяжка жылося. Ні калоці нэ можна было, ні ціулкі нэ можна было зарэзаці. Ну, колоці можна было, но трэба было браці швайку, а як возьмэш, то трэба ж ім, немцам, половіну, чы кулькі там. Можна было продаці, але ўладам. Прыватно продаці нэ можна было ні свіню, ні корову. А кобылу — позвалялі. Але ж коня як продасі, то нэ было чым ораці, трахтороў яшчэ нэ было, одны коні былі. Так было. Ну, тут немцы ведалі, што кормят партызантку і як узнают, прыйдут, забэрут усё, колбасы зжэрут, а ты як сабе хоч. Нэ можна было калоці, але калолі, хаваючыся. Бойсе, нэ бойсе, што хоч, але ж есці трэба. Закалоў, схаваў под подлогаю і тады ходзіш, по кускові достаеш. Такія прынцыпы ўводзілі акупанты. Здаралася, што без прычыны расстрэлівалі: От так, узялі і росстрэлялі. Часом і свої людэ наговорылі, што комуніст, або што другое. А немці нэ розбіраліся. Так жэ і з моім татом было — жадны камуніст, але росстрылялі.

Нас, студэнтаў, крыху здзіўляе прысутнасць вайны ў гэтых прыстарэлых вёсках. Здаецца, прайшло шэсць дзесяткаў год, а даволі ўключыць мікрафон, зараз вытыркаюцца з-за нябачных акопаў партызаны, на танках і веласіпедах пад'язджаюць немцы.

— Помню, было мне шаснаццаць. На колёніі жыў, а яны ішлі. На танках ехалі, на роварах. Акопы былі шырокія на 5 — 6 метраў. Небам ішлі рускія самалёты, а немцы ўцякалі. Адзін падышоў і кажа мне: „Іван, Гітлер капут”. Так сказаў. А раней то і партызаны прыходзілі. Прыйдуць дзе-лень — есці давай. Не дасі — уцякай. І колёністы, хто на хутарах жыў, до села ўцякалі, дзе больш людзей. А добытак аставаўся. Выцягнуць паршука, заколюць, зжэруць. Цяжка дагадзіць партызанам. А прытым хто ведае — партызаны яны, ці проста звычайныя людзі, якім хоцелася добра паесці.

Ёсць, што назначана

Сонца схіляецца далёка на захад, калі прычаляем да апошняй лавачкі, на ўскраіне вёскі. Баба Гандзя зірыць за намі, а на першае пытанне аб мінуўшчыну, рэзка махае рукой.

— А што там про колісне. Тэпэр то добры час, оно на чом то кунчыцця. А так то час добры — і для молодёжы і для всех старых. Колісь трэба было робіті, а тэпэр то што ж, достанэш якуюсь рэнту то і седіш. Оно тэпэр то добівае самотносьць, тое, што ўжэ седеті о, тако трэба.

А што будэ? Што назначанэ, тое і е. Помню, была ў нас такая бабушка, дэвэносто лет. Выйдэ на лавочку, сядэ і правіт, оно рот роздзявіш. Деткі, кажэ, будут пташкі, такія пташкі жэлезны летаті, і будут людэ говорыті з собою нэ бачыўшы один одного, а ў вас будут по хатах тожэ сцены говорыті. Тое зараз і е.

Над вуліцай крыляць буслы, склікаюцца ў вырай. Як заўсёды ў жніўні.

— Як вэсною бусла обачыш стоячы то будэш целы рок нэшвідкі, дэ тобе будэ трэба то ты спузьнішся. А як ужэ обачыш летячы, то всіуды будэш пэршы і всіуды будэ помысьльне.

Вясной будзем сачыць за лятучымі бусламі.

Апрацавала Basovka

Цытаваныя расказы сабраныя ў вёсках Кленікі, Сапава, Кожына ў час „Беларускіх маладзёжных станіц” гуртком маладых людзей, які прабываў у Кленіках у днях 9-14 жніўня 2004 г.

Бардаўская восень

Гурт „Рэха”, саліст Андрэй Такінданаг

Бельск 22-24.10.2004

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Таццяна Беланогая — Гран-пры

Яўгенія Согаль — узнагарода Радыё Беласток

Вольга Казанцава — узнагарода бельскага БГКТ

Знаёмства ў тую эпоху

(заканчэнне; пачатак у 43 н-ры)

Мая сустрэча з Быкавым праз амаль чвэрць стагоддзя ад тых гродзенскіх пад наглядам па-расійску „всевидящих глаз” мела месца ў час афіцыйнага візіту Станіслава Шушкевіча ў Беластоку. Прыезд высокага госця адбываўся з існа прэзідэнцкім размахам! На трасе картэжу аўтамашынаў паліцыя спыняла камунікацыйны рух на вуліцах горада, арэапаг імчаў з вялікай хуткасцю, апярэджаны сігнальнымі „пеўнікамі” ахоўнікаў. Шушкевіча тытулавалі прэзідэнтам Беларусі, наведаўся ён у шмат-якія цэнтры беларускай культуры ў Беластоцкім краі (абавязкова ў Бельск і Гайнаўку, Супрасль). Мы, польскія беларусы, перажывалі эйфарыю, нам круцілася ў галаве ад шчаслівасці: нарэшце не сіроты мы Еўропы, за намі стаіць нацыянальная дзяржава!!! Па сёння не магу сцяміць, па чыёй рэкамендацыі далучана мяне да польскага ўрадавага боку, і я, уведаўшы, што са сп. Шушкевічам ёсць Васіль Быкаў, пажадаў знаходзіцца побач яго якраз.

Васіль халадзіў маю патрыятычную гарачку душы, паўтараючы тым жа манатонным голасам: „Яшчэ невядома, чым усё гэта закончыцца”. Запамятаўся быкаўскі скепсіс, які ўспрыняў я з прыкрай неахвотаю, хоць пагаджаўся, што ў Беларусі ўжо мала беларусаў. Не верылася, што гісторыя можа паўтарацца, каціцца адпераду назад. І не падумалася пра набліжэнне дзевяноста чацвёртага. Зянон Пазьняк меў святую рацыю: прэзідэнтура ў беларускіх умовах — гэта вяртанне цэкоўскага першасакратарства. Толькі парламенцкая дзяржава здольная асвяжыць закасцянелую вякамі нацыю. „Спасёт Россию не Бог, не царь и не герой...”

Я распавёў тады Быкаву пра ўсенькія сакрэтныя перыпетыі нашых гродзенскіх сустрэчаў, што ўспрыняў ён, так сказаць, абыякава. Даўным-даўно было тое, забылася; перайшоў жыць у іншы ж свет, у якім гродзенска-беластоцкая кадэбоўшчына „сущая ерунда”. Так мы і пагаманілі за банкетным сталом у камфартабельным гатэлі. Уразіў мяне Шушкевіч культурнасцю ды начытанасцю і таму неяк ясным было, што доўга ён не пратрымаецца ў палітыцы, трэба дадаць: савецкай. Аглабельнай, хамуцкай, цемрашальскай.

Дваццаць восьмага лютага 1998 г. вячэраў у Быкавых на Танкавай. Былі яшчэ Сяргей Законнікаў і Міхась Шаховіч, „белавежац”. Кулісы і гэтай сустрэчы маюць сваю этымалогію, пакручастую гісторыю. Аднойчы ў Каляду пазванілі з РБ у Крынкі, што ў Мінску выйшла мая кніжка, прычым мінулай восенню. Што за кніжка? Якая кніжка?! Пакуль успомніў, што, сапраўды, гадамі назад, бадай аж у васьмідзесятыя, здаў я ў „Мастацкую літаратуру” аповесць-раман „Сцяна”, — выдадзены ў польскім перакладзе ажно ў семдзесят дзевятым, — і доўгі шэраг апавяданняў. Калі тое было! Не маючы надзеі на савецкую ласку, пакарыстаўся нагодаю выдаць гэтую ж кніжку ў сябе, у Польшчы, пад назваю „Доўгая сьмерць Крынак”. У 1993 годзе. А праз пяць гадоў пасля раптам з'явілася яна ў Мінску... Ну, добра, але чаму нехта падняў наверх маю літаратурную археалогію? Наколькі ведаю савецкія хітрыкі адносна беларускага замежжа, выпуск „Сцяны” не мог мець альтруістычны характар, а мусіла вязацца з нейкім свінствам. Але якім?! — у Бога — Мацеры!?

Зазванілі тэлефоны з якогасьці міністэрскага камітэта каб прыехаў я ў Мінск на прэзентацыю яе... „Сцяны”. Мне вельмі не хацелася, пачаў ставіць тым з камітэта фінансавыя ўмовы, спадзеючыся, што галотная ўлада адчэпіцца. Праз тыдзень які зноў званілі, пагаджаліся, і я тады выдумляў новыя, але яны там, падумаўшы-падумаўшы, ізноў пагаджаліся. Я, урэшце, і паехаў, болей з цікавасці, чаму тамтэйшым антыбеларускім уладам так моцна залежыць на прысутнасці якраз беларускага пісьменніка(?). Як было, так было, шэра і нудна, але спраўдзіліся падазрэнні, што мая „Сцяна” павінна была адыграць дыверсійную ролю супроць рыхтаванай незалежнай грамадскасцю да друку „Сьцяны” Васіля Быкава. Што рабіць? Абавязкова наведацца да Васіля, патлумачыць. Апраўдацца! Выспавядацца! Абмыцца! У гэтым дапамог Сяргей Законнікаў — наладзіць візіт на кватэру Быкава. Памятаю, стаяла перадвеснавое надвор'е, паганая пагода. Ішлі мы якойсьці занядбанай вуліцаю.

Быкаву не трэба было нічога занадта распавядаць; запрасіў на хатнюю вячэру. Крыху пажартавалі са жлобскага афіцыёзу; ён збіраўся, здаецца, у Фінляндыю. І як гэта ў мінскіх гутарках — гаварылі загадкамі, намёкамі, якія я не заўсёды разумеў, не жывучы пад саветамі. Вынес з таго вечара адну важную тэзу: беларуская мова і культура шкодзіць расійскім інтарэсам у Беларусі, таму так заядла зніштажаюць усенька беларускае. Ідэал палітыкі ў РБ — давесці да таго, каб сам народ не захацеў быць беларускім. „Мы, белоруссы, ведь те же русские!”

Калі Рэспубліка Беларусь ёсць дзяржаваю рускіх, дык не мае яна сэнсу існавання, акрамя як адміністрацыйнае акругі.

Васіль Быкаў паспачуваў маёй сітуацыі беларускага пісьменніка ў Польшчы. Пішу на беларускай мове як творча аптымальнай мне, але скласці кніжку на ёй няпроста: перакладаюць маё палякі ахвотна ды ў бягучых тэмпах, затое тэксты арыгіналаў залежваюцца, пакрываюцца пылам. Паспачуваў па-свойму лагічна: думаеш — Беларусь нам тут маткаю? Яна ж не нацыянальная, але рэштавіна СССР. Тут надалей будуюць „светлае заўтра”, замест салідна ўзяцца за працу. Абавязвае камуністычнае „чудо”, як „самые, самые” ва ўсіх адносінах, нават „самые умные в мире”. Гэта ж, каб хоць дурнота... Ды не! Можна сказаць: нявылечная хвароба. Што чакае беларусаў? Доўгі застой, пасля якога яшчэ даўжэйшае выходжанне ў людзі. Поўная рэалізацыя прароцтва Янкі Купалы. Які народ, такая і ягоная ўлада. Рэдка здараецца ў гісторыі, каб улада рабіла больш, чымсьці вымушана. Пакуль існуе сякая-такая беларуская нацыя, ёсць надзея на лепшы лёс, няхай і праз пакаленне. Але, калі прападзе беларуская нацыя, а Беларусь пераўтворыцца ў расійскую правінцыю, дык яе лёс будзе лёсам правінцыі, заглухлай адміністрацыйнай акругі, высмактанай маскоўскім цэнтрам. Баюся, што так менавіта і збудзецца, Сакраце.

Так я пабачыўся з Ім апошні раз. Потым спрабаваў запрасіць Яго на еўрапейскі Беларускі Трыялог у Крынках, але Ён ужо быў хворы, аказалася, цяжка.

Сакрат Яновіч, лістапад 2003 г.

Матэрыялы ў многім адпавядаюць мэтам і задачам Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі БНФ і яе старшыні Зянона Пазьняка...

www.bielarus.net

Сярэдзіна кастрычніка была характэрная для Беларусі важнымі палітычнымі падзеямі, якія хочаш не хочаш, але падштурхнулі да ўзросту грамадзянскай актыўнасці. Некаторыя выказалі свае адносіны да рэферэндуму і выбараў прыняўшы актыўны ўдзел у галасаванні, другія — пратэстам супраць вынікаў гэтага галасавання, а ў віртуальнай прасторы з'явіўся новы сайт прысвечаны беларускай палітыцы.

Калі вы набярэце на сваім камп'ютэры адрас www.bielarus.net, то на вашым маніторы з'явіцца даволі сціплае выяўленне гэтага новага аналітычнага сайта. Называецца ён „Беларуская салідарнасць". Гэтыя словы напісаныя на сіняй палосцы ў самым версе выяўлення. Далей мы можам убачыць карту Беларусі і герб „Пагоня" на яе фоне.

Змест першай старонкі адразу вызначае, што матэрыялы ў многім будуць адпавядаць мэтам і задачам Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі БНФ і яе старшыні Зянона Пазьняка.

Першы артыкул пачынаецца з кароткай гісторыі стварэння руху БНФ „Адраджэньне", што адбыўся яшчэ ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Далей ідуць артыкулы пра адносіны З. Пазьняка да цяперашняй палітычнай сітуацыі ў Беларусі, апошніх падзей. Частка артыкулаў прысвечана Курапатам, усяму таму што з імі было звязана пасля вядомага адкрыцця праўды.

Трэба адзначыць, што кожны артыкул на гэтай старонцы падаецца толькі назвай і першым абзацам. Каб прачытаць цэлы тэкст, трэба клікнуць альбо на назву, альбо на аранжавую стрэлачку ў канцы абзаца.

Выхады да астатніх рубрык сайта знаходзяцца ў двух месцах — уверсе над назвай і справа ў невялікай калонцы. Першай рубрыкай ідзе „Аналітыка". Варта адзначыць, што яна не надта выгадна адрозніваецца ад першай старонкі, дзе і без таго прысутнічаюць усе гэтыя аналітычныя артыкулы. Таму не надта зразумела, навошта распрацоўшчыкам сайта ўвогуле трэба было яе ствараць.

Тое самае адбываецца і з рубрыкай „Курапаты", якая ідзе наступнай. Пазнаёміцца са зместам яе артыкулаў можна, знаходзячыся на галоўнай старонцы. З гэтага хочацца даць невялікую параду стваральнікам сайта — варта неяк перарабіць галоўную старонку, стварыць яе крыху больш інтрыгуючай і не дублюючай іншыя.

Рубрыка „Літаратура" альбо „Прыгожая літаратура" (у кожным месцы назва падаецца па-рознаму) адрозніваецца ад папярэдніх якраз адсутнасцю дублявання. Тут можна пазнаёміцца з аповесцямі слынных майстроў пяра замежжа — Жоржа Амаду, Бертольда Брэхта і Аўгуста Стрындберга.

Паразмаўляць з іншымі наведвальнікамі сайта прадастаўляе магчымасць „Форум". Праўда, „гаваркіх" наведвальнікаў згодна статыстыцы там пакуль няшмат. Магчыма з-за нядаўняга з'яўлення „Беларускай салідарнасці".

Сайт мае таксама англамоўную версію. Праўда, яна значна бяднейшая за беларускамоўную. Так, у англійскай версіі „Аналітыкі" месцяцца толькі два артыкулы. „Курапаты" прадстаўлены трыма.

Калі ў цэлым ацэньваць сайт „Беларуская салідарнасць", то варта адзначыць яго глыбокую аналітычнасць. І няхай яна, гэтая аналітычнасць, прадстаўлена толькі з пункту гледжання кансерватыўна-нацыянальнай ідэалогіі. Да прац З. Пазьняка можна па-рознаму ставіцца, пагаджаючыся з імі альбо не. Але падаецца, што яны ўжо сёння вартыя вывучэння ўсімі тымі, хто хоча займацца палітыкай у Беларусі і для Беларусі.

Уладзімір Лапцэвіч

Найбольшых поспехаў у валейболе на клубным роўні дасягалі беларускія жаночыя клубы...

Беларусь, беларусы...

У Беларусі валейбол мае даўнія карані. З'явіўся на нашых землях ён у пачатку 1920-х гадоў, калі ў Віцебску, Гомелі, Мінску былі створаны каманды. Найбольшых поспехаў на клубным роўні дасягалі беларускія жаночыя клубы. У 1960-я гады мінскі „Спартак" быў прызёрам вельмі моцнага чэмпіянату СССР. У 1986-1987 гадах мінскія дзяўчаты з „Камунальніка" паўтарылі той поспех, а неўзабаве заваявалі еўрапейскі Кубак уладальнікаў кубкаў. Самыя вядомыя айчынныя валейбалісты Аляксандар і Юрый Сапегі — выхаванцы гродзенскай школы, прызёры алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы.

На пачатку 1990-х жаночым валейбольным флагманам заставаўся „Камунальнік" (пазней ён выступаў пад назвай „Амкадор"), на базе якога фармавалася канкурэнтнамоцная зборная. Пазней валейбалісткі раз'ехаліся па легіянерскі хлеб, а нацыянальная дружына заслабла. У мужчын клубнае лідэрства ў мінскага СКА перахапіў гродзенскі „Камунальнік", які больш іншых перамагаў у нацыянальным першынстве і рэгулярна ўдзельнічаў у розыгрышах кантынентальных кубкаў. Гродзенскі клуб вырас з юнацкага валейбола ў самабытную каманду, шэраг гульцоў якой складалі касцяк зборнай. „Камунальнік" перажыў за гэтыя гады шмат — лакальныя поспехі на міжнароднай арэне, трагічную смерць аднаго з лідэраў Сяргея Барана, змену галоўнага трэнера.

У чарговым, чатырнаццатым па ліку, мужчынскім чэмпіянаце краіны спаборнічаюць восем удзельнікаў. Гэта чэмпіён краіны ГВК з Гомеля, гродзенскі „Камунальнік" (срэбны прызёр), салігорскі „Шахтаспецстрой" (бронзавы), брэсцкі „Заходні Буг", магілёўскі „Тэхнаприбор", жлобінскі „Металург", віцебскае „Марка-Дынама-01", а таксама сталічны новаствораны „Фенікс". Апошні ёсць „нашчадкам" колішняга СКА і адроджаны як прыватны клуб. Асноўныя фаварыты першынства — гомельцы, якімі кіруе Ігар Загорцаў, у нядаўнім адзін з лідэраў нацыянальнай дружыны, і гродзенцы, якія прагнуць вярнуць чэмпіёнскі тытул. Каманду з-над Нёмана трэніруе Уладзімір Салікаў, які стаіць ля стырна і галоўнай каманды краіны — зборнай Беларусі. Што датычыць зборнай, то яна зусім нядаўна завяршыла дэбютны для сябе адбор у адной з груп дывізіёна „А". У кваліфікацыі да чэмпіянату Еўропы-2005 нашы занялі трэцяе месца, хаця змагаліся досыць годна. Беларусы саступілі ў групе Харватыі — 2:3, Іспаніі — 1:3 і перамаглі Славаччыну — 3:1. Але адзін беларус усё ж прабіўся ў фінальную частку. Гэта Вадзім Яўтуховіч, які натуралізаваўся на Балканах і выступае за харватаў.

У жаночым нацыянальным турніры ўдзельнічаюць сем каманд: мінскія „Белбізнесбанк" і „Славянка", баранавіцкі „Атлант", гродзенскі „Нёман", гомельская „Надзея", брэсцкі „Дываноўшчык" і наваполацкая „Дружба". Тут асноўныя прэтэндэнты на лідэрства брэсцкія валейбалісткі і сталічныя клубы — шматразовы чэмпіён „Белбізнесбанк", а таксама амбітная юная „Славянка", дзе галоўным настаўнікам ёсць трэнер зборнай Уладзімір Казлоў.

Хаця нацыянальную федэрацыю і ўзначальвае старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура, колішні міністр камунальнай гаспадаркі, валейбол у Беларусі не так палітызаваны як хакей ці футбол. Так што развіццё яго ідзе больш натуральна.

Уладзімір Хільмановіч

Занатоўкі кантрабандыста

Скупасць і зайздрасць

Кожны ведае што скупасць ды зайздрасць — кепскія якасці. Але калі яны яшчэ і перасякаюцца, то церпяць ад гэтага ўсе навакольныя. А найперш носьбіты гэтых якасцяў.

Калі нам паведамілі, што Мікола Разумны звар'яцеў, мы спярша не паверылі. Але пасля подленькая чалавечая натура пачала ў многіх браць верх. Чалавек схільны верыць у тое, у што хочацца. А Міколу далі мянушку „Разумны" якраз за тое, што ён быў адным з самых вынаходлівых і самых шанцавальных кантрабандыстаў. Каб можна было запатэнтаваць тыя вынаходніцтвы па нелегальнай перавозцы алкаголю праз мяжу, якія прыдумаў Разумны, ён стаў бы багацейшы за Біла Гейтса. Але Мікола ад скупасці стараўся трымаць свае лёсаносныя для чалавецтва вынаходніцтвы ў сакрэце. Таму яго і не любілі зайздроснікі. А зайздроснікаў, як вядома, нашмат больш, чым добразычлівай публікі.

Я знайшоў Разумнага ў лесе недалёка ад Гайнаўкі. Ён сядзеў на сырой зямлі і размаўляў са сваёй машынай.

— Цяжка стала жыць, — скардзіўся Разумны. — У нас алкаголь падаражэў. У Польшчы хочуць плаціць усё танней. Працаваць стала невыносна.

Машына нічога не адказвала. Але, мяркуючы па сумным выглядзе яе тупой морды з надпісам „Москвич", было бачна, што яна цалкам пагаджаецца са сваім гаспадаром.

— Таму няма ніякога выйсця, акрамя як браць танную няякасную прадукцыю, разліваць у прыгожыя бутэлькі і выдаваць за фірменны тавар, — працягваў дыялог з машынай Мікола. — І не глядзі на мяне так. Сам ведаю, што гэта дрэнна. Але табе гэты бруд у бак заліваць не буду. А маёй кліентуры ўсё адно што піць. Абы танней.

Хлопцы чакалі майго прыходу як манны нябеснай. Яны ведалі, што я шанаваў Разумнага. І таму, як убачылі мой сумны твар, усё зразумелі. А калі я паставіў дыягназ „паехаў мазгамі", пачаліся „народныя гулянні". Добрая палова прысутных заўсёды зайздросціла кемлівасці і вынаходлівасці Разумнага. І таму, ад радасці што пазбыліся самага моцнага канкурэнта ў сваім нелегальным бізнесе, пачалі піць бязбожна. Нават Гольдэн, у якога напярэдадні адкрылася язва страўніка, і які быў у многа разоў больш скупы чым Разумны, не зважаючы што лекар забараніў яму і думаць пра гарэлку, ад радасці выпіў цэлую літроўку і амаль не даў дуба. Каб не даць яму мажлівасці працягваць гэты банкет ужо са святым Пятром, давялося нават выклікаць лекара.

Карацей, зайздрасць цешылася з таго, што скупасць здурнела ад скупасці. Але калі назаўтра ўбачылі Разумнага жывым і здаровым, ды яшчэ з самым танным на свеце спіртам, зайздрасць амаль не задыхнулася ад зайздрасці. Зайздроснікі пачалі сачыць за кожным крокам Разумнага, каб хоць неяк яму нашкодзіць.

Я ведаў адкуль узяўся самы танны алкаголь. Але маўчаў. Мікола так навучыўся яго закаркоўваць у бутэлькі з прыгожымі наклейкамі, што ні адзін эксперт не змог бы адрозніць гэты напой ад сапраўднага. Але калегаў-кантрабандыстаў падмануць нашмат цяжэй, чым нейкіх там экспертаў. Яны вельмі хутка ўцямілі што тут робіцца і толькі чакалі моманту, каб усунуць Разумнаму палку ў колы.

Доўга чакаць не давялося. Нехта падказаў нам, што недалёка ад Саколкі будзе вялікае вяселле. Гандляры алкаголем адразу кінуліся туды, каб збыць сваю прадукцыю. А самая танная была ў Разумнага. Ды не паспеў ён і двума словамі перакінуцца з пакупнікам, як у размову ўлез Раман з Бераставіцы.

— Танны алкаголь гэта добра, — робячы заклапочаны выгляд заявіў ён пакупніку. — Але ж трэба думаць і пра здароўе гасцей. А маладым гэтага піць увогуле не дазваляйце. Бо вяселле можа плаўна перайсці ў паховіны.

— Ты што вярзеш, — стаў бараніцца Разумны. — Я сам і ўся мая радня толькі гэта і п'ём. І нічога не стала.

— Твая радня — бяздомныя бамжы са сметніка, — не здаваўся Раман. — Ім усё адно што піць. А тут збяруцца людзі непрывыклыя да дэнатурату. Добрая палова адыдзе ў лепшы свет. Калі хочаш давесці іншае, сам выпі пры нас пляшку. А мы пачакаем калі акалееш.

— Так, так, — стаў настойваць напалоханы да смерці пакупнік. Ён, ад усяго што пачуў, ужо ўяўляў усё вяселле, гасцей, маладых, і нават святара, які тут ніколі не адмаўляўся ад выпіўкі, ляжачымі ў адной вялікай труне. — Паспрабуй спачатку сам.

Што было рабіць. Разумны ўпэўненым рухам хапіў літроўку, зубамі здзёр корак і прысмактаўшыся да гарляка зрабіў некалькі глыткоў. І тут здарылася непрадбачанае. Ці то сапраўды гарэлка была кепскай, ці хлопец проста папярхнуўся, але неяк хутка пасінеў і паваліўся на зямлю. Праз хвілінку падняўся як нічога і не было. Але пакупнік ужо ляцеў ад нас так хутка, нібы за ім гналася сама смерць. А ў гэтай вёсцы з тае пары людзі не купілі ў кантрабандыстаў ні адной бутэлькі. Пацярпелі ўсе. І скупыя, і зайздросныя. Ды і самі людзі. Недзе праз год пасля гэтага выпадку іх пакарала паліцыя. Амаль у кожнай хаце знайшлі апарат для вырабу самагонкі.

Сымон Нальшанскі

Наш час

Наш час
Прайшоў, ты знаеш гэта.
Прапаў,
Затхнуўся на дарог
Скрыжаванні.
Не ведаем куды, якой дарогаю
Пайсці.
Шкада цяпер?
Чаго ж шкада?..
Ты чуеш, гадзіннік
Адкукаваў зязюляй
Поўнач.
На досвітку слязою
У падушку зляжаш а раніцай
Вочы пачырванелыя падымеш...
Пачні ўсмешкай даўняй
Новы
дзень.
Раскрый замёрзлае акно.
Марозны вецер асвежыць
Грудзі і будзе добра...
Новы дзень.

Юрка Харкевіч

Светлай памяці Юркі Харкевіча

Табе жадалі сто гадоў,
А смерць прыйшла так нечакана,
Спыніла Твой кароткі час
Роўна ў пяцьдзесят.

Табе бы жыць, далей спяваць
Па-беларуску, у „Маланцы",
Але лёс вырашыў інакш
І Ты ўжо спіш у бельскай зямельцы.

„Маланка" зноў будзе спяваць,
Нясці цяпло людзям у песнях...
Цябе, друг, будуць успамінаць,
Астанешся жывым у сэрцах.

Смуткуюць, Юрка, па Табе,
У Лешуках і ў Ляўкове,
Старая маці слёзы л'е,
А Ты не чуеш яе болю.

З сумам гаворыць пра Цябе
Твая радня ў Альхоўцы,
Учора Ты спяваў у сне
Табе адданай цётцы Юльцы.

А над магілаю Табе
Няхай спявае песні вецер
Па-беларуску кожны дзень,
Кожную раніцу і вечар.

Мікалай Варанецкі

Жыў з беларускай песняй

22 мая 2004 года ў пяцідзесяцігадовым узросце памёр **Юрый ХАРКЕВІЧ**, асоба заслужаная для беларускай культуры. Выпускнік Гайнаўскага белліцэя і рускай філалогіі Люблінскага універсітэта ад паловы васьмідзесятых гадоў спяваў у бельскім хоры „Васілёчкі", а з 1990 года ў калектыве „Маланка". Апошнім часам выступаў таксама ў калектыве „Цаглінкі" і спяваў у царкоўным хоры ў Ляўкове. Яшчэ ў падставовай школе пісаў у „Зорку". Пасля прысылаў артыкулы і вершы ў „Ніву". У сакавіку гэтага года ў нашым тыднёвіку прадставіў ён сваю прапанову наконт Беларускага музея ў Гайнаўцы. У Лешуках падрыхтаваў экспанаты, але не паспеў іх перадаць.

У сям'і Юрыя Харкевіча прыгожа спявалі амаль усе. Добры голас меў яго бацька Аляксандр Харкевіч, які працаваў кіраўніком падставовай школы ў роднай вёсцы — Лешуках. У час сямейных мерапрыемстваў невялічкі Юрка спяваў разам з братамі, а як белліцэіст — выступаў на школьных мерапрыемствах.

— Я першы раз заўважыў Юрку Харкевіча як ліцэіста, калі выступаў у конкурсе беларускай песні ў Доме настаўніка ў Гайнаўцы. Пасля працаваў з ім у хоры „Васілёчкі і калектыве „Маланка", — успамінае Сяргей Лукашук, дырэктар Бельскага дома культуры. — Быў ён чалавекам сардэчным і паслужлівым. Вельмі ангажаваўся ў працу нашых музычных калектываў і выступленні на сцэне. Калі трэба было, то прыходзіў і памагаў у арганізацыйных справах. Спяваў моцным тэнарам, некаторыя партыі песень выконваў сола.

Выступаючы на сцэне, Юрка Харкевіч забываў пра цяжкасці, з якімі сустракаўся на рабоце. А прафесійна працаваў ён настаўнікам, выхавацелем у школьным інтэрнаце, паліцыянтам і куратарам у судзе. Жыхары Бельшчыны ведаюць яго як каменданта паліцыі ў Орлі.

— Вялікая была заангажаванасць Юркі ў справы беларускай культуры. Вельмі добра прапагандаваў яе, выступаючы ў беларускіх калектывах. Паколькі добра ведаў беларускую мову, ахвотна даваў інтэрв'ю на для беларускіх журналістаў радыё і тэлебачання, — кажа Сяргей Лукашук. — Не пакінуў нашага калектыву нават тады, калі перасяліўся ў Лешукі. Хаця папрасілі яго выступаць у „Цаглінках", прыязджаў таксама на канцэрты „Маланкі". Бывала, што на веласіпедзе ехаў з-пад Нараўкі ў Белавежу, каб спяваць разам з намі. Пасля выступленняў не баяўся вяртацца ноччу праз пушчу.

— Юрка быў сапраўдным беларусам. Гаварыў, што песня гэта яго жыццё, — кажа дваюрадны брат пакойнага Аляксей Харкевіч. — Цікавіўся жыццём беларусаў на Падляшшы і беларускай літаратурай. Пераехаўшы жыць у Лешукі, хацеў дапамагаць Гайнаўскаму беларускаму музею.

— Юрка Харкевіч быў сімпатычным мужчынам і заўсёды на яго твары гасціла ўсмешка. Здавалася, што ў яго не было праблем. У адносінах да знаёмых быў сяброўскім, — кажа працаўніца Бельскага дома культуры.

Жыў ён з сям'ёй у Бельску-Падляшскім і быў пахаваны на бельскіх могілках.

Аляксей Мароз

Сіла волі

У канцы верасня адзначаўся Сусветны дзень сэрца. Сродкі масавай інфармацыі прысвяцілі гэтаму многа месца. Праводзіліся ў краіне (бясплатна, разумеецца) шматлікія кардыялагічныя абследаванні. Медслужба гэтым чынам хацела даказаць, што сэрца маем адно і трэба яго шанаваць. Па статыстыцы вядома, што 75 працэнтаў грамадзян пакутуе ад празмернай вагі, якая ў большасці з'яўляецца прычынай сардэчнай недастатковасці. Не без значэння ў гэтым выпадку маюць неакуратнае харчаванне, курэнне папяросаў ды брак руху. Значыць, мы павінны больш часу праводзіць на прагулках ды веласіпедных катаннях. Але для гэтага неабходная сіла волі. Не памогуць „цуд-дыеты", калі будзем аб'ядацца тлустымі ды смажанымі стравамі і спажываць замнога цукру ды солі.

Некалькі гадоў таму я моцна патаўсцеў. Пачало падводзіць здароўе. Ногі млелі ды ціск крыві павысіўся да 230/120. Апынуўся я ў шпіталі. Дыягназ просты: скінуць лішнія кілаграмы. Колькі я не намагаўся, а „пухкім" надалей заставаўся.

Зараз усё перамянілася. Скінуў больш дваццаці пяці кілаграмаў. Многія сябры ў час сустрэчы пытаюць: „Што з табою, хварэеш?". А я адказваю: „Добра сябе адчуваю". Магу пасяброўску перадаць чытачам сваю „цуд-дыету". Хачу прытым адзначыць, што для гэтага неабходная сіла волі. Штодзень на снеданне спажываю страву па рэцэпту — 3-4 сталовыя лыжкі аўсяных шматкоў (płatków), шчопаць кукурузных (найлепш „Corn Flakes") і лыжачку мёду, заліваю пераваранай вадой або малаком. Можна дадаць кусочкі фруктаў. Абед і вячэра нармальныя ў назначаны час. Але без лішняга „пад'ядання". І многа, многа язды на ровары. У мяне вынік атрымаўся. А ў вас, ці хопіць на гэта сілы волі?

Уладзімір Сідарук

На культуру ніколі „замнога"

З чытаннем у Падляшскім ваяводстве справа не найлепш маецца. У 2003 годзе ў ваяводстве працавалі 244 бібліятэкі, прычым 51 у гарадах і 193 на вёсках. Па структуры, гэта 114 гарадскіх і гмінна-гарадскіх ды 130 філіялаў. У дзвюх вясковых гмінах Браньск і Высокае-Мазавецкае, як і ў гарадской Замбруў няма ніводнай бібліятэкі (у гэтай апошняй працуе адно школьны філіял). У шасцідзесяці гмінах, што ў агульным ліку складае 53% стану, працуе адна бібліятэка. У дваццаці васьмі гарадскіх і трох вясковых вылучаны дзіцячыя аддзяленні. У маштабе ваяводства працуюць 86 бібліятэчныя пункты, у гэтым ліку 20 у гарадах і 66 на вёсках. Адпаведна да 2001 года былі ліквідаваны філіялы ў Бельску-Падляшскім і Кленіках (Чыжоўская гміна). Панізіўся прытым стан чытачоў на 2 817 ды лік пазычаных тамоў на 114 787. У 2003 годзе складаў ён 145 197 чытачоў і 2 873 002 пазычаныя кніжкі. Панізілася зацікаўленне чытаннем у крузе школьнай моладзі ва ўзросце 15-19 гадоў ды рабочых. Больш сталі чытаць студэнты, дзяржаўныя чыноўнікі і земляробы. Для шырэйшага распаўсюджвання чытання, падляшскія бібліятэкі ўключыліся ў акцыю „Cała Polska czyta dzieciom" і „Czytajmy razem". Арганізаваліся аўтарскія сустрэчы ды конкурсы мастацкага чытання вершаў. У адукацыйнай дзейнасці ўздымаліся экалагічныя тэмы, як і веды аб рэгіёне. Сумнай з'явай з'яўляецца тое, што мясцовыя самаўрады абмяжоўваюць грошы на культуру. На Гайнаўшчыне, напрыклад, у Кляшчэлях не знайшлося ніводнай залатоўкі на закупку кніжак, а ў Дубінах (гміна Гайнаўка) адведзена на гэту мэту адно 997 зл., у Чыжах — 1 000 зл. і ў Дубічах-Царкоўных 1 004 зл. Аб падпісцы на газеты і часопісы лепш не гаварыць. У бібліятэках на Падляшшы маецца 6 580 беларускіх кніжак, 8 476 рускіх, 7 052 літоўскіх і 64 украінскіх. Гэта складае 0,5% агульнага стану кнігазбораў, з часопісаў: 16 — беларускіх, 3 — літоўскія, 4 — украінскія і 1 расійскі.

Праблема чытання, як і недахоп фінансавых сродкаў не толькі праблема Падляшскага ваяводства. Тычыцца такое ўсёй краіны. Як заявіла віцэ-міністр культуры Агнешка Адаровіч у стратэгіі развіцця культуры ў 2004-2006 гадах прадбачваецца ўвялічанне фінансавых сродкаў на гэтыя мэты на 1 мільярд 800 мільёнаў злотых больш. Яшчэ ў гэтым годзе знойдзецца ў цэнтральным бюджэце 10 мільёнаў зл. на закупку кніжак, а ў наступным — 30 мільёнаў на разбудову г.зв. інфраструктуры. Гэтымі грашыма пакарыстаюцца бібліятэкі, кінатэатры, музеі і г.д.

Уладзімір Сідарук

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 2 300 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2005 r. upływa 5 grudnia 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

Студэнтка, якая вучыцца ў адлеглым горадзе, прыязджае на канікулы і паведамляе бацькам:

— Мама, тата, маю хлопца!

— Мы вельмі рады! А якая ў яго прафесія: лекар, інжынер, журналіст?

— Даражэнькія: яму толькі два месяцы.

* * *

Вадзіцелька самахода адбіваецца ад бардзюра, ударае ў іншы самаход, ломіць дрэва і спыняецца на плоце. Падбягае да яе паліцыянт:

— Будзьце ласкавы прадставіць мне свае правы!

— А вы толькі лагічна падумайце: а хто ж бы мне іх даў!

* * *

Да вадзіцелькі, якая паставіла самаход у месцы, дзе стаянка забаронена, падыходзіць паліцыянт:

— Ці вы выпадкова чаго не заўважылі? — пытае.

— Бачу, што ў вас нядбайна адпрасаваная кашуля.

* * *

Два сябры спрачаюцца перад крамаю з гарэлкай:

— Куплю дзве, — кажа першы.

— Не купляй дзвюх, бо не вып'ем, — адгаворвае другі.

— Куплю дзве!

— Не вып'ем.

Першы, аднак, не ўступіў. Уваходзіць у краму і заказвае:

— Мне скрынку гарэлкі і дзве бутэлькі ліманаду.

* * *

Псіхіятр да пацыента:

— Вы поўнасцю здаровы! Можаце спакойна вяртацца дадому...

— Вельмі шкада: цэлы год быў Напалеонам, а цяпер астаўся нікім.

* * *

Бацька да сынка:

— Ты забыў, што нельга гуляць запалкамі?

— А я не гуляю, я прыкурваю папяросу.

* * *

Змучаны муж вяртаецца з працы дадому. Ужо на парозе дадумваецца, што нешта здарылася.

— Не гавары мне толькі пра клопаты, — просіць жонку, — у мяне іх на працы хоць адбаўляй...

— Згода, пачну ад добрай весткі: як ведаеш, маем трое дзяцей і аж двое з іх не зламала сёння ні рукі, ні нагі.

* * *

— Калі ксяндзы задаволены цэлібатам?

— Калі слухаюць, з чаго жанчыны спавядаюцца.

Выступае гурт „Індыга"

Пад бел-чырвона-белымі сцягамі!

Магнітам сёлетняга фестывалю „Музыка звыш падзелаў" быў несумненна англійскі гурт „The Ukrainians" і „Н.Р.М."

На канцэрт, які адбыўся 16 кастрычніка г.г. у беластоцкім клубе „Гвінт", прыйшлі сотні фанаў і амаль да канца пяцігадзіннай імпрэзы пад сцэнай панавала гульбішча.

Самай бліскучай зоркай імпрэзы стаў мінскі рок-гурт „Н.Р.М.". Пад іх музыку ў растанцаваным натоўпе залуналі бел-чырвона-белыя сцягі. Шэдэўр „Тры чарапахі" спявала поўная зала. Паклоннікі „Н.Р.М." — беластоцкая моладзь (беларусы, палякі, іншыя нацыянальнасці) выхаваныя на „Басовішчы". Што раз бачыліся БАСаўскія кашулькі, з перавагай майкі з бел-чырвона-белым сцяжком („Басовішча 2003"). Пасля публіка доўга не хацела адпусціць „Н.Р.М." са сцэны.

Шырока рэкламаваны гурт „The Ukrainians", які выступіў на канцы, хоць прыцягнуў тлумы, часцей ад захаплення, чуліся словы крытыкі:

— Oni chyba zbyt mało ćwiczą. To nie jest to samo co na płytach, — каменціравалі пакідаючы залу ў час іхняга выступлення.

Беларускія матывы паявіліся ўжо на пачатку імпрэзы, першым дзелам пайшоў сёлетні лаўрэат „Басовішча" рок-гурт „Тарпач", а за ім „Індыга". Пасля кожнай песні, звычайна чуўся вокліч: „Жыве Беларусь!".

* * *

У час канцэртаў не абышлося без скандалу, які справакаваў бел-чырвона-белы сцяг. Карацей, у час танцаў, з рук беластоцкіх гімназістак нахабна быў вырваны беларускі незалежніцкі сцяг. Сцяг прапаў. Злоўлены на гарачым учынку маладзён паводзіў сябе быццам хворы. Плакаў, бажыўся:

— To nie ja! To nie ja! — крычаў.

Пасля некалькіх хвілін ад інцыдэнта, той самы маладзён захапіў другі сцяг і пакамячыў яго на вачах ніжэйпадпісанай. Тады таксама крычаў: To nie ja!

Пошукі першага сцяга цягнуліся ўвесь канцэрт. Урэшце пад канец, калі за згубай упамянуліся на сцэне арганізатары, а ў зале пачалі разглядацца за віноўнікам, сцяг знайшоўся... Падкінулі яго ў раздзявальні.

— Гэты сцяг мы сёння ўвесь дзень шылі, спецыяльна на канцэрт, — кажа мама гімназісткі, якая не даравала нахабніку і пад пагрозай паведамлення паліцыі давяла справу да шчаслівага фіналу.

Як пасля высветлілася бел-чырвона-белы сцяг выдзіраў і пакамячыў маладзён з... Гайнаўскага белліцэя!

(гак)

Войт

Войт штодня па гміне трэцца.
Войту ўсяляк удаецца
Войт — да водкі, войт — да піва
З войтам зрабіць можна дзіва.

Чалавек войтам бывае,
Сваю гміну даглядае.
Ён цяжару не баіцца,
Сваёй гмінай ганарыцца.

Усе законы ён спаўняе
Людзям добра дагаджае:
Найляпей, каб усё зрабіць,
Бо далей войтам хоча быць!

Мікалай Лук'янюк

Адгаданка



1. рака з Семяноўскім вадасховішчам, 2. вядзе захопніцкую палітыку, захапіў чужую тэрыторыю, 3. важная фігура, асабліва ў картах, 4. Аляксандр Рыгоравіч. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 38 нумара

Кот у куток.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

31.10 – 6.11

Баран (21.03. — 19.04.) Пакінь вечныя прэтэнзіі да ўсіх і ўсяго. Не кожнае тваё рашэнне беспамылковае. Пайдзі да дантыста праверыць зубы, бо можаш неўзабаве шкадаваць. Варта выбрацца на прыроду, пакуль не захаладна.

Бык (20.04. — 20.05.) Наведай натуральных медыкаў (варта будзе табе пазнаёміцца з усходняй зёлкавай медыцынай). Пры тлустым харчаванні магчымая пякотка (дадавай да страваў майран). Твае „скокі ўбок" могуць рассакрэціцца.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Зноўку не дбаеш аб страўнік! І ежа, і напоі, і стрэс давядуць цябе да язвы, калі яшчэ не давялі! Варта шчыра паразмаўляць вока ў вока, бо інакш усе справы заблытаюцца яшчэ больш.

Рак (22.06. — 22.07.) Сямейныя сустрэчы, можа не найвесялейшыя. Знайдзі час толькі для сябе самога, дай волю роздумам пры гарачай гарбаце з ромам. А што! Ці ты мусіш быць сам адзін „лякарствам на ўсё зло" свету?..

Леў (23.07. — 22.08.) Можа дапасці цябе асенняя хандра. Не раздумвай у адзіноце; плач па разлітым малацэ нічога не паможа. І так іншыя могуць мець горш за цябе. Маеш магчымасць бліснуць у кампаніі, нават міжнацыянальнай.

Дзева (23.08. — 22.09.) З тупымі чыноўнікамі можа і варта пазмагацца, але ж не ўставіш ім розуму (асабліва калі нарвешся на Барана). Справы можаш аформіць, але ў гэтым тыдні лепш „адпусці сабе". На тваё сэрца варта стаць прымаць каэнзім Q-10, найлепш з лецітынам.

Шалі (23.09. — 23.10.) Найгоршы час, здаецца, мінуў. Калі ўсё ў парадку, мабыць, ты паслухаўся перасцярог зорак. І табе прыдасца той каэнзім Q-10, у тваім выпадку на дзясны; не застудзі зубоў і касцей.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Казалі табе: не навальвай сабе на карак столькі ўсяго! Працагалізм горшы ад алкагалізму ды нікацінізму ды шмат чаго яшчэ! І так у гэтым тыдні цябе ўшануюць і ацэняць стаpанні. Дома прытулі таго, каго трэба. Дакажы недаказанае, бо лепш не маўчаць, а сказаць праўду. Прасцей будзе ды лягчэй на сэрцы.

Стралец (22.11. — 21.12.) Вучням: на родным шмат можна выйграць! Добры тыдзень на размовы ў сямейным крузе. Пі гарбату з ліпавага цвету і чорнай бузіны. Калі ў цябе няма праблемы з язвай, спадзявайся на аспірын.

Казярог (22.12. — 20.01.) Не пераймайся залішне справамі на працы ці ў школе. Неабавязкова яны на лязе нажа, а ты можаш страціць нервы. Калі ты паўналетні, можаш спадзявацца на сто грамаў, з мёдам, а на закуску — часнок.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Лаві творчыя моманты! Муза не спіць! Калі не пішацца, не думаецца, не робіцца чамусьці — выберыся, напрыклад, у Супрасль ці ў Белавежу. Можна і ў Страшава...

Рыбы (20.02. — 20.03.) Твой нясцерпны настрой можа давацца ў знакі супрацоўнікам. А ў цябе, можа, шванкуе страўнік? Не еш усяго ў сухамятку, на беражку табурэткі альбо і стоячы.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960


Барыс Пятровіч ☞ II

Ніва
ЛІТАРАТУРНАЯ

Наша прыцяганне

З Міхасём АНДРАСЮКОМ, аўтарам новага зборніка апавяданняў „Мясцовая гравітацыя", размаўляе Міра Лукша.

— „Чаму дарослыя сталыя мужчыны пішуць кніжкі?"

— Хіба можна сказаць, што кожны чалавек нейкім чынам стараецца выявіць сябе. Кожны шукае сваю прастору. Людзі выяўляюцца ў мастацтве, а і ў штодзённай празаічнай працы. Гэта нам павярхоўна так здаецца, што чалавек займаецца нейкім гандлем, на тое, каб выжыць, каб зарабіць на хлеб, але ён стараецца ў гэтым гандлі ўгледзець самога сябе. І я якраз адчуваю, што магу сябе выявіць словам, пісаным словам. У прозе. І хіба толькі так.

— Ці быў у цябе момант, як у пісьменніка з апавядання „Дом", што „меў жаданне напісаць кнігу важкую і незвычайную"?

— Можа недакладна так. Кожны ў жыцці хоча зрабіць штосьці важнае і незвычайнае. Гэта такая метафара. Ты таксама арыентуешся дасканала, што, калі пачынаеш пісаць, не ведаеш, ці гэта будзе незвычайнае, і ці гэта будзе дакладна тое, менавіта тое, што хочаш пераліць на паперу.

— Апісваеш сваё, апісваеш сябе.

— Дакладна так.

— Той твой герой-пісьменнік стараецца даць адказ на пытанні: „Што ёсць быццё? Што чалавек? Што справядлівасць, а што праўда?" Гэта ж верш.

— Я прызнаюся, што гэтыя словы я свядома ўкінуў з аднаго з вершаў Яна Чыквіна. Але адказы на такія пытанні шукаюцца людзьмі спакон вякоў, ці не ад пачатку чалавецтва. І, здаецца, адказу на гэтыя пытанні ніхто яшчэ не знайшоў. І добра. Бо не было б сэнсу чалавеку ісці далей.

— Тлумачыць той пісьменнік: „Пра час пішу". Ты апісваеш час і былы, і сённяшні мястэчка. Падзеі, людзей. Маладых, старых. Рахманых, што не адчуваюць свае вагі, і напыхлівых, упэўненых у сваёй вялікасці...

— Няма аб'ектыўнага часу, каб можна было сказаць, што гэта актуальны, сённяшні час. Нават у адным чалавеку пераклікаецца тое, што было і мае вялікі ўплыў на тое, што адбываецца і на тое, што прыйдзе. Можам толькі запісваць хвіліну, прынамсі спрабаваць. Запісаць нейкае ўражанне, настрой. А запісаць час у сэнсе адлюстравання нейкае падзеі, нейкія сацыяльныя, эканамічныя ўмовы?..

— Настрой, эмоцыі, уражанне... Здаецца, гэта найлепш можна выказаць у лірыцы. Ты, на мой погляд, паэт...

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

— Паэзія — выспяванне думкі, настрою. Не кожны можа быць паэтам.

— Некаторыя аўтары лічаць, што калі ўжо пісаць аб рэчаіснасці і тыя эканамічна-палітычныя фактары часу, падзей, дык толькі ў тоўстым рамане, а не ў абразку, кароценькіх навелах ці апавяданнях. Ты, па сваёй натуры, ці не найлепш выказваешся ў кароткай форме.



— Мне здаецца, што час тоўстых раманаў, дзе, быццам на фатаграфічнай плёнцы адмалёўваўся свет, па сутнасці ўжо адышоў. Зараз у людзей зусім іншыя тэхнічныя магчымасці запісаць падзеі, хоць бы на нейкай фільмавай стужцы. Гэта так як у мастацтве. Можна намаляваць каня, усе яго жылкі, кожны валасок. Але таксама добра можна таго каня сфатаграфаваць, перадаць наступным пакаленням. Я ведаю, што тут справа не толькі ў адлюстраванні. Малюючы гэтага каня можна намаляваць яго характар, норавы. Вяртаюся да тоўстых раманаў. Сапраўды, гэта не мая форма.

— Твае кнігі апавяданняў, і „Фірму", і новую „Мясцовую гравітацыю", можна чытаць як адну форму аповеду, у нейкіх быццам бы адслонах, у замалёўках. Як працяг гісторыі мястэчка, якое ты „ўшыр і ўздоўж сам паспеў стаптаць глыбокімі слядамі". Ты родам не з самога мястэчка, імя якога ў гэты раз не гучыць ані разу (успамінаецца толькі раён Юдзянка). Але ягоны вобраз, як той партрэт у адным з апавяданняў — „насычваецца бацькавай, а затым і дзедавай усмешкай". Так „распранаеш" і яго, і герояў „з адзення, аж паказваецца самае тайнае" („Мроі"). З чаго распранаеш яго, з таго, што невядомае яму самому? І робіш гэта са шчымлівай увагай, сардэчна...

— Ну, на маю думку, мала людзей зусім злых. У кожным чалавеку ёсць і нешта адмоўнае, і штосьці станоўчае. Мне больш цікава тое, што ў чалавеку станоўчае. Нават калі яго няшмат. А прытым гэта кніжка, як ты сказала — адслоны. Так. Але ж і чалавек, жыццё чалавека — не нейкі матэматычны рахунак. Чалавек нават і не думае катэгорыямі доўгай, шырокай аповесці. Нашы думкі гэта ж такія абразкі — здарэнняў, успамінаў, усё тое перасякаецца. Нашы думкі гэта такі цудоўны сродак камунікацыі, які дазваляе падарожнічаць з аднае хвіліны ў другую. Думаем проста...

— „Сярод нас ёсць і Клёсы, і Штырліцы, і Чапаевы. Ёсць адзін Пушкін і адзін безыменны Прафесар..." Ёсць лёс. Паасобных людзей, які ў нейкім сэнсе хоча іх уніфікаваць. Вось, ветэраны, вось, маладыя, якім не ўдалося. Яны, аднак, асобныя. Ты якраз раскрываеш іх шматколернасць і адрознасць ад іншых. Нават калі, мабыць, здаюцца быць не зусім цікавымі, займальнымі для чытача, які такіх сустракае на вуліцы, на падворку. Яны і смешныя. А ты з чуласцю паказваеш „чалавекаў канкрэтных, сціплых, тутэйшых", як той Марусь-кравец, чыя прыгода і мроі кончыліся поўным канфузам. Яны, здаецца, і крыху падобныя на цябе, аўтара. Ты і сам сабе „раскрываеш дзверы (...) фантазіі, каб выправіць яе ў неабмежаваныя прасторы і сцежкі". Быццам бы ходзіш па вам вядомых сцежках. Колькі ў іх з цябе?

— У кожнага аўтара няма магчымасці адысці ад сябе. Гм... Я да сваіх герояў не адношуся з пазіцыі настаўніка, які мае свае меркаванні і злуецца на вучняў, калі яны на гэтыя меркаванні не пагаджаюцца. Стараюся наогул успрымаць людзей такімі, якімі яны ёсць. Кожны чалавек мае права на сваю індывідуальнасць.

— Кожны з тваіх герояў марыць аб поспеху, добрым жыцці. „Хочацца ім на Велікодныя выспы" ці хоць паправіць няўдалы нос. У іх ёсць мары аб каханні і ўшанаванні іх саміх і ўсяго „мястэчка, якое не горшае ад іншых" (каб хоць займець зубра з залатымі рагамі!).

— Чалавек мроіць. Стараецца быць лепшым, чым ёсць. Наогул мары здзяйсняюцца. Беларусы, на маю думку, мінімалісты. Часам нават стараемся кантраляваць нашы мары, каб задалёка не адышлі ад рэальнасці, каб было праўдападабенства на тое, што збудуцца. Марусь не разлічваў на абсалютную перамену, не ўлічваў яе ў жыццёвых планах. І ў такі момант не пазбегчы катастрофы.

— Твае героі, Міхась, у большасці „звычайныя мужчыны. Па іх біяграфіях не здымалася кіно, не пісаліся гераічныя аповеды... Іх гісторыя пісана (...) дробным макам штодзённых мазалёў". І яны „паміраюць так ціха, што можна падумаць — не паміраюць ніколі". Твае, Міхась, вобразы, мабыць, вечныя, як і гэтыя дзяды....

— Заўсёды, ад дзяцінства, задзіўлялі мяне размовы старых людзей. Яны, увайшоўшы ў гады, ад сябе не адрозніваюцца. Гэта такі своеасаблівы аўкцыён, хто больш хворы.

— Гэта так як і з „маімі" „бабамі".

— Звычайна ім не пашчасціла ў жыцці. Не адзначылі іх медалямі-ордэнамі, дык падсвядома самі сабе ствараюць уласныя вартасці, свае ордэны. Менавіта тыя хваробы, якія ўзніклі ў рэзультаце негультайскага жыцця, а працавітага. Прытым не мае значэння, ці ад тае працавітасці атрымалася нейкая карысць. У нас характэрна цяжка працаваць дзеля самое працы. Не ведаю, ці наша пакаленне, калі нам сядзе на карак 80 гадоў, будзе іншае. Будзем таксама працягваць гутаркі нашых дзядоў.

— Жывем жа „ў вёсках і мястэчках кропля ў кроплю падобных на нашы". Паўтараем „свой шлях, круцімся ў зачараваным коле на сярмяжных вяроўках мясцовай гравітацыі"...

9 770546 196000

„Дзеяслоў” і Саюз



Фота ІАЛАНТЫ КАБЗАР

Размова з Барысом ПЯТРОВІЧАМ, галоўным рэдактарам часопіса „Дзеяслоў”, І намеснікам старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі

„Ніва”: — „Дзеяслоў”, двухмесячнік, незалежны літаратурны часопіс у Беларусі, у верасні адзначаў свой невялікі юбілей.

Барыс Пятровіч: — Юбілей маленькі — два гады ад першага нумара. Выйшла пакуль дзесяць нумароў, два новыя неўзабаве выйдуць, трошкі спозненыя, паколькі друкарня была занята справамі рэферэндуму і выбарамі. Часопіс узнік крыху нечакана для нас саміх. Рэдакцыя працавала ў „Полымі”. І ніхто не думаў, што хтосьці захоча стварыць холдынг, каб узяць беларускія часопісы пад дзяржаўнае крыло. Ад пачатку было вядома, што хочуць увесці цэнзуру дзеля таго, каб адсочваць сітуацыю ў літаратуры. Мы з гэтым не пагадзіліся і ў знак пратэсту выйшлі з рэдакцыі — галоўны рэдактар Сяргей Законнікаў і я як намеснік, і амаль уся наша рэдакцыя, таксама цалкам уся рэдакцыя „Крыніцы”, амаль цалкам рэдакцыя „Нёмана”. І тады ўжо стала зразумела, што на месца гэтых забраных часопісаў павінны з’явіцца новыя. Стаў выходзіць „Дзеяслоў” як альтэрнатыва дзяржаўным выданням. Вакол яго згуртаваліся лепшыя сілы беларускай літаратуры. Тыя, хто прынцыпова адмовіўся друкавацца ў дзяржаўных выданнях. На сёння ў нас друкуюцца класікі беларускай літаратуры — Янка Брыль, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Уладзімір Някляеў, Святлана Алексіевіч. Яны друкуюцца выключна ў нас. Апроч таго — пісьменнікі сярэдняга пакалення і маладзейшыя. Паколькі „Дзеяслоў” на сёння адзіны альтэрнатыўны часопіс, можам друкаваць пісьменнікаў незалежна ад узросту. Тое, што друкуецца ў „Дзеяслове” — саме лепшае ў беларускай літаратуры.

— Як распаўсюджваецца „Дзеяслоў”? Можна яго набыць, напрыклад, у газетным кіёску?

— На сёння можна яго купіць выключна ў кнігарнях альбо ў прыватных распаўсюджвальнікаў. На жаль, у „Саюздрук” мы не патрапілі. Не ўзяў нас на распаўсюджванне па вядома якіх прычы-

Чэслаў Мілаш і...

Чэслаў Мілаш явіцца мне як абаронца рэдкіх відаў, прысуджаных на знікненне. Пад такім знакам крыжаваліся нашы дарогі. Таму замест пашаны, якую аддаем памерлым, хачу распавесці пра паклёпы, якія сустрэлі паэта за абарону нацыянальных меншасцей, між іншым, беларусаў.

Пачну з генаў талерантнасці, на якія спасылаецца Мілаш, і якія з’яўляюцца ключом да праблемы.

Хоць сам паэт па нацыянальнасці паляк і католік, з гонарам пералічвае сямейныя сувязі з сербамі, літоўцамі, яцвягамі. Пад канец XIX стагоддзя ягоная бабуля заснуе школку літоўскім дзецям. Школа польская, але красамоўны тут жэст дзеда, які з прыватнай кішэні фундуе ўрокі літоўскай мовы.

У біяграфічных успамінах сустракаем будучага паэта на віленскім панадворку, дзе разам гуляе з яўрэйскімі дзяцьмі. Іх кантактнай мовай была руская, якую будучы паэт памятае з бежанства. І гэтая моўная сітуацыя, як пасля гадоў адзначыць, бачыцца як звычайная з’ява ў польскай Вільні.

У студэнцкія гады (калі вывучае, між іншым, Літоўскія Статуты) сутыкнецца з беларускімі, жыдоўскімі і літоўскімі нацыянальнымі дзеячамі ды інтэлектуаламі. У 1938 годзе, калі над краінай шырыцца фашысцкая зараза, праявіць адвагу і талерантнасць.

Амаль нічога не ведаем пра „страшныя справы” Чэслава Мілаша. Сам паэт з агідай вяртаецца да няслаўных старонак віленскай гісторыі. Усё ж выходзяць яны на святло, звычайна ў сувязі з бягучымі акалічнасцямі. Вось, імпульсам для прыгадання славутай „страшнай справы” ёсць прывітанне ад беларускага паэта, паўстагоддзя пазней. Прывітанні з Беларусі прывозіць кінарэжысёр, брат, Анджэй Мілаш. У „Партрэце перакорлівым” выдадзеным у 1988 годзе, знаходзім фрагмент:

— Poeta białoruski, Maksym Tank, jak usłyszał jego nazwisko, to się rozpromienił i prosił, żeby przekazać mnie największe pozdrowienia i że byłbym serdecznie witany, gdybym przyjechał na Białoruś. Dlaczego? Dlatego, że my z Tadeuszem Byrskim byliśmy bardzo probiałoruscy i prolitewscy[1].

Як вядома лаўрэат Нобелеўскай прэміі не паспеў наведаць Беларусь. Зараз прапаную прыблізіць чытачу, у чым заключалася яго прабеларуская дзейнасць.

* * *

Але пакуль вернемся ў даваенную Вільню, варта прыгледзецца карціне з нашага панадворка. Я мела шчасце пабываць на „экалагічнай” сустрэчы з паэтам (яна мела быць засакрэчанай ад СМІ — што падзейнічала як магніт і журналісты прыперліся табуном!). Падзея адбылася ў Белавежы, 6 жніўня 1998 года і „Ніва” адзначыла яе на першай старонцы.

Мілаш гутарыў пра свае дзіцячыя захапленні светам прыроды і патрэбу аховы Белавежскай пушчы. Высечку дрэў параўноўваў да разбірання па цагліне Вавельскага замка. Тады, менавіта, быў прыняты ў рады Сяброў Белавежскай пушчы, з рук якіх апрача Граматы атрымаў слой пушчанскага мёду і праваслаўную ікону св. Герасіма — патрона звяроў і раслін.

Да іншага падарунка, які склалі тры беларускія песні „Магутны Божа”, „Ой, калі той вечар” і „Многае лета” і я мела свой уклад. Проста, падтрымала белавежскіх сяброў, у якіх не было ўпэўненасці ў слушнасці выбару рэпертуару.

— Ды ці спадабаюцца госцю нашы песні, — сумняваліся спевакі, — хоць раней сталі лаўрэатам Міжнароднага Фестывалю царкоўнай музыкі.

І сапраўды, вынік атрымаўся складаны для інтэрпрэтацыі. Калі ў зале залуналі меланхалічна-карункавыя напевы хору, запанавала магільная ціш. Чэслаў Мілаш узрушыўся (што ўлавіў мой фотаапарат), але нічога не сказаў, хоць раней жыва каменціраваў усе падарункі.

У маёй спаваздачы быў намёк, менавіта на вымоўнае маўчанне паэта.

* * *

Ужо праз тыдзень я была ўпэўнена, што беларускія песні спадабаліся паэту. Пра гэта сведчыў допіс з Гайнаўкі, пра які раскажам пазней.

Сёння, пасля шасці гадоў ад белавежскай сустрэчы, у „Партрэтах непакорлівых” знаходжу адказ не толькі на „белавежскае” маўчанне, але і апісанне беларускага руху ў даваеннай Вільні:

— A co do Białorusinów, — паэт піша пра канец трыццатых, — ich obecność w Wilnie była bardzo słaba. Być może, że w dużym stopniu z tego powodu, że Białorusini byli bardzo tępieni przez władze polskie. Emancypacja młodzieży białoruskiej pochodzenia chłopskiego oznaczała automatycznie orientację na Mińsk, gdzie pokazowa białoruszczyzna była eksponowana i oni natychmiast robili się komunistami. Więc władze polskie ich prześladowały i to gimnazjum białoruskie było ciągle zamykane. Właściwie chór białoruski był ich jedyną trwałą instytucją; jak to znamy bardzo dobrze, folklor czy muzyka ludowa jest ostatnią ostoją narodową. Myśmy z Byrskim byli bardzo za tym chórem, za tą muzyką, ponieważ to bardzo piękny, niezwykle piękny folklor muzyczny[2].



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Чэслаў Мілаш на шпацыры ў Белавежы

* * *

Пакуль дойдзем да „страшнай справы” прапаную спыніцца пры апошнім зборніку эсэ „Чэслаў Мілаш, падарожжа і час”, выдадзеным у 2004 годзе, яшчэ пры жыцці.

Чаму? Чэслаў Мілаш пад канец жыцця ўваскрашае асобу Францішка Аляхновіча. Асоба беларускага драматурга — як сімвал бяздомнасці праўды, і яго прыклад мае дапамагчы ў зразуменні трагічнага лёсу Густава Герлінга Грудзінскага, аўтара „Іншага свету”.

Вось фрагмент, які сведчыць не толькі пра польска-беларускія кантакты, але і разуменне механізмаў мыслення, якое замест бараніць вядзе да катастрофы.

У 1933 г. наступіў абмен палі-

„страшныя рэчы”

Чэслаў Мілаш
1911 — 2004

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

тычнымі вязнямі паміж Польшчай і Савецкім Саюзам. З польскай турмы быў вызвалены дзеяч беларускай Грамады Браніслаў Тарашкевіч, з салавецкага лагера, узамен, Францішак Аляхновіч. У Аляхновіча за плячыма было сем гадоў катаргі, інстытута прыдуманага царамі, які ў будучыні развінецца ў магутную сетку ГУЛАГу. Аляхновіч зразумеў сутнасць сістэмы падпертай тэрорам.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У час выступу белавежскага праваслаўнага прыхадскога хору

Мы слухалі і чыталі яго ў Вільні, прыхоўваючы непрыстойнае падазрэнне польскай, а дакладней заходняй, ментальнасці, карацей, думалі, што калі ёсць кара дык мусіць быць і тут нейкае злачынства.

Польская прэса пісала, зразумела, таксама пра Салаўкі, пра савецкі тэрор, ды чым больш была правай, тым ахвотней пісала і гэта паменшвала верагоднасць інфармацыі ўсім, якія правых не любілі, хоць там была поўная рацыя.

Аднак Аляхновіча польская прэса не цікавіла, ён хацеў прамовіць да беларускіх студэнтаў і паэтаў заварожаных чырвонай зоркай, бо там у Мінску, беларускую мову ўвялі ў школы і універсітэты, а ў Польшчы наадварот — закрываліся беларускія школы, беларускіх дзеячаў садзілі ў турмы „за камунізм”. Аляхновіч хацеў асцерагчы перад тым што мела здарыцца, значыць, замест беларускай мовы ў школе — руская, а тую жменьку інтэлігенцыі, якая хацела стварацъ беларускую культуру, закатавалі ў Курапатах. Так ці інакш навука Аляхновіча паказалася непрыдатнай і сёння ніхто ў свеце, а можа і ў Беларусі, не памятае яго прозвішча[3].

* * *

Праўда, імя Францішка Аляхновіча замоўчанае ў афіцыйным беларускім жыцці. Не хапае сродкаў на аднаўленне намагільнага помніка Яму на віленскіх Росах. І таму прысутнасць яго асобы ў пісьменнасці Чэслава Мілаша мае неацэннае значэнне.

Канец трыццатых гадоў, якія запамятаў паэт, праходзіць пад знакам беспрацоўя.

— Trudno wtedy było zdobyć złotówkę. Więc siedziałem w Wilnie, ale tam zmienił się kurs polityczny, przyszedł wojewoda Bociański, który zaczął stosować metodę twardej ręki przede wszystkim do mniejszości: Białorusinów, Litwinów. To była polityka wariacka. My byliśmy prolitewscy i uważaliśmy całą politykę za szaleństwo[4].

У гэты час паэт працаваў на віленскім Польскім радыё. Згаданы ўжо Тадэвуш Бырскі быў намеснікам рэдактара.

— І на радыё, — успамінае Мілаш, — былі „дзіўныя”, зважаючы на палітычны курс адміністрацыі, рэчы. Бо выступалі беларускія хоры, беларускія дакладчыкі. Яўрэі выступалі з гутаркамі на рэлігійныя тэмы.

Гэта менавіта і ёсць тыя „straszne rzeczy”, якія не падабаліся адміністрацыі. Варожая кампанія і паклёпы пачаліся ў правай прэсе. На першую лінію антыменшаснага фронту выступіў „Малы дзённік” айца Максімільяна Кольбэ. Сябры-журналісты, падмацаваныя нацыяналістычна-касцельнымі аўтарытэтамі, судзілі іх за „страшныя рэчы” (чытай беларускія песні, жыдоўскія гутаркі). Паводле іх, Мілаш і Бырскі — заснавальнікі камуністычнай ячэйкі на польскім радыё!

У выніку напасці і прыгавораў, найперш Мілаш, а пасля Бырскі былі звольнены з радыё.

— Wtedy wyjechałem z Wilna. A potem, w kilka miesięcy później to spotkało Byrskiego[5].

* * *

Традыцыйна пра беларуска-белавежскія спевы хору з парафіі св. Мікалая ў жніўні 1998 г. і далейшыя беларускія матывы на шляху паэта, прамаўчала польская беластоцкая прэса, хоць апісала сустрэчу з фатаграфічнай дакладнасцю.

А вось які быў тады працяг белавежскай сустрэчы... Мілаш спыніўся ў Гайнаўцы. Якое там было свята! Наш карэспандэнт, Юльян Казбярук, адзначае:

— Беларускі музей нечакана наведаў выдатны паэт, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Чэслаў Мілаш (...). Нам было вельмі прыемна. Сустрэча атрымалася сімпатычнай. Госць адразу пайшоў паглядзець экспанаты і затрымаўся там найдаўжэй. Усе экспанаты яго цікавілі, многа распытваў і многа гаварыў. Расказваў, што падобныя прадметы ён бачыў на сваёй роднай Віленшчыне (...). Пасля ў музейнай бібліятэцы адбылася сустрэча гасцей з супрацоўнікамі Музея. Спатканне прайшло ў сардэчнай атмасферы[6].

На канец Чэслаў Мілаш упісаўся ў музейную хроніку:

— Як жа я рады, што Беларускі музей у Гайнаўцы паўстаў і што паступова развіваецца і багацее яго фонд. Мае самыя сардэчныя пажаданні далейшай паспяховай працы доўгія гады[7].

Здаецца, каментарый тут непатрэбны. Кожны, хто сутыкнуўся з творчасцю Чэслава Мілаша, ведае яго захапленне этнаграфіяй. Менавіта, яго родны дом — як любіў прадстаўляць маёнтак Шавелы на Ковеншчыне — быў з XVII стагоддзя. Такую выснову падказвалі прадметы ў дзедавым маёнтку: драўляныя кросны, брычкі, саматканыя матэрыі...

Адтуль, маўляў, паэт — значыць з часоў Вялікага княства Літоўскага — яго метрыка і ген талерантнасці, які наказвае абараняць рэдкі від.

Ганна Кандрацюк

1 Czesława Miłosza autoportret przekorny / Rozmowy przeprowadził Aleksander Fiut. Kraków 1988.

2 Там жа.

3 Bezdomność prawdy — Czesław Miłosz o podróżach i czasie, Kraków 2004 (пераклад з польскай мовы Г. К.).

4 Czesława Miłosza autoportret przekorny...

5 Там жа.

6 „Чэслаў Мілаш у Белавежы і Гайнаўцы”, „Ніва” № 23 за 1998 год.

7 Там жа.

нах. Тлумачыўся, што шапікі завалены літаратурнымі выданнямі, якія не карыстаюцца попытам. Але з наступнага года мае быць падпіска на „Дзеяслоў”, унеслі нас у падпісны каталог.

— Якая сітуацыя ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў? Быў моцны ціск, каб ён распаўся.

— Сітуацыя пагаршаецца з кожным месяцам. Адміністрацыя прэзідэнта, забраўшы нашу сядзібу, пакінула была нам трэці паверх. Там застаўся цяпер адно кабінет старшыні і прыёмная. Тлумачаць тым, што маем плаціць за арэнду. Пагражаюць нас адтуль зусім папрасіць. А што тычыцца падзелу Саюза, гэта, дзякуй Богу, не адбылося. Як ні стараліся некторыя нашы пісьменнікі зрабіць гэта, праз холдынг, і засноўваючы гарадскую арганізацыю, але не пайшоў за імі ніхто з аўтарытэтных. Яны, мабыць, спадзяваліся на Івана Пятровіча Шамякіна, нядаўна памерлага, зямля Яму пухам, але ён паглядзеў у спісак і сказаў, што там адны творчыя імпатэнты і не хоча мець з імі нічога супольнага. І таму на сёння іх арганізацыя ў зародкавым стане, не развіваецца і не мае ніякага ўплыву на сітуацыю ў Саюзе. Большасць пісьменнікаў уваходзіць у адзіны і непадзельны СПБ, падтрымлівае палітыку кіраўніцтва.

— А як вашы кантакты з пісьменнікамі Расіі? Там жа аж пяць пісьменніцкіх саюзаў.

— Падтрымліваем адносіны практычна з адным, Міжнароднай супольнасцю пісьменніцкіх саюзаў, пераемнікам Саюза пісьменнікаў СССР, якому шэфствуе Сяргей Міхалкоў, дзіцячы аўтар, аўтар гімна СССР. Зараз старшыня СПБ Алесь Пашкевіч у Маскве, на сустрэчы, якую праводзіць Саюз пісьменнікаў Масквы. Так што стараемся падтрымліваць кантакты і з маскоўскімі, і з украінскімі пісьменнікамі. З польскімі — пакуль іх няма.

— Затое ёсць кантакт з беларускімі польскімі...

— Вельмі рады бачыць іх на старонках „Дзеяслова”. Друкаваліся ў нас Ян Чыквін, Алег Латышонак, Міра Лукша, Сакрат Яновіч. Былі прапановы і іншым аўтарам. Творы можна дасылаць па электроннай і звычайнай пошце. Нашы чытачы чакаюць!

— Дзякуем за размову.

Размаўляла Міра Лукша



Гісторыя кахання Іштвана Дабі

У далёкія (сямідзесятыя) гады на старонках літаратурнай „Белавежы" ў „Ніве" друкаваўся венгр. Лісты прыходзілі з Гданьска. Вядома, па-беларуску, на някепскай мове. Значыць, трапіўся нейкі паліглот, які яшчэ і на нашай матчынай мове можа выказацца ў вершы? Лірыка ж — найбольш інтымнае ў душы, а выказаць гэта можна найлепш, пэўна, на найбольш блізкай сэрцу мове. А ці не прасцей жа ж, калі хто ўжо хоча, ім, паліглотам, на больш у свеце папулярных мовах, напрыклад, англійскай. Не на мовах малых народаў, як беларускі, венгерскі ці і польскі. Нямодных?

Вялікая старая Еўропа, якая, каб выжыць і аднавіцца ва ўсёахапляючай і уніфікуючай глабальнасці, павінна рушыць залежы сваіх маладых, невялікіх, каштоўных, часам амаль не чапаных іншымі, рэсурсаў культуры, якая ёсць уласнасцю ўсяго кантынента. Адкрыць сябе нанова.

Імя Іштвана Дабі прагучала з вуснаў доктара Лаёша Палфолві, навукоўца і перакладчыка, на апошнім Беларускім трыялогу.

* * *

Гэта ўжо трыццаць шостая гадавіна сужонства Галіны і Іштвана. Як кажа спадарыня Галіна, былі ў гэты доўгі перыяд і роспач, і апантанне, хвіліны прыгожыя і поўныя штодзённых клопатаў. Як у кожнай *love story*. У шасцідзесятыя гады была яна студэнткай Віленскага педагагічнага інстытута, на факультэце раманскай філалогіі. Паходзіла з польскай сям'і. Кончыла польскі ліцэй, танцавала ў ансамблі „Вілія". „Сельска-анёльскае" дзяцінства прамільгнула ў літоўска-польска-рускай кампаніі. Студыі — на „руска-французскай" мове. Вельмі любіла пісаць лісты, і пры дапамозе студэнцкага часопіса „Радар" карэспандавала з амаль усім светам. Знайшла там і адрас свайго будучага мужа. Вельмі зацікавіла яе, што 18-гадовы маладзён ведае 18 моў. Аб ім паказаліся артыкулы ў розных закутках свету. Разам з часам, калі Галіна кончыла студыі, канчалася рэпатрыяцыя ў Польшчу. Ейныя браты ўжо былі выехалі. Туга па радзіме была аграмадная, хоць каханая Вільня для Галіны — як для венгерца — Сяміград. На 25 годзе стала жыхаркай Гданьска. Карэспандэнцыя з моўным геніем працягвалася. У час „Андрэйкавай" забавы воск выліўся ў постаць дробнага чалавечка, даўганосага, худога, мізэрнага, у знішчаным берэце, самотнага на вяршыне скалы. Вандравала ў той час па свеце, хоць тады падарожжы былі палітычна абмежаваныя. У 1969 г. агарнула яе ахвота паехаць у Будапешт, „сацыялістычны Парыж", на Новы год. А што за зіма была ў тым годзе! Мароз да — 25°С. Цягнік застраг недзе ў Татрах. Іштван усю ноч чакаў цягніка на вакзале Келеці. Цягнік спыніўся. Перад вагонам стаяў сціплы чалавек. Пазнала яго адразу, хоць не бачыла яго раней нават на здымку.

Ужо па сямі днях будучы муж купіў пярсцёнкі, спакаваліся і апынуліся ў Гданьску. Адразу з вакзала пабеглі ў ЗАГС падаць дакументы. Пасля шлюбу муж паехаў дахаты, а жонка аж у жніўні 1970 г. Жылі ў свякрухі, Іштван працаваў перакладчыкам. Два гады Галіна плакала, не могучы прывыкнуць да венгерскай ментальнасці. Вярнуліся ў Гданьск. Галіна працавала ў ліцэі настаўніцай французскай мовы, Іштван бываў у літаратурным свеце. Гэта быў час яго найбольшай творчай актыўнасці. Тады і стаў пасылаць у „Ніву" свае допісы па-беларуску. Перакладаў кнігі, друкаваўся ў часопісах, супрацоўнічаў з радыё, выдавецтвамі.

У 1971 г. нарадзіўся ім сын Іштван-Мікалай. Рашылі, што дзіця ад калыскі будзе двухмоўнае. З бацькам размяўляў па-венгерску, з маці — па-польску. З усіх польска-венгерскіх сем'яў Гданьска толькі іхныя дзеці размаўляюць спраўна на абедзвюх мовах.

Праз дзесяць гадоў іх жыцця ў Гданьску прыйшла „Салідарнасць". Іштван пабаяўся паўтору венгерскага 1956 года. Намовіў жонку да выезду. У час ваеннага становішча, без жыццёвых здабыткаў, з пару валізкамі можна было выехаць. Усю маёмасць пакінулі сваякам. Праз нейкі час перавезлі кнігі — іхны адзіны жыццёвы скарб. Тысячы і тысячы кніг на розных мовах. У той час дзеці Дабіх праследаваліся ў школе, Іштвана распытвалі, чаго вярнуўся. Штудзіраваў у той час арабістыку і англістыку, але быў прымушаны кінуць школу. Быў настолькі хуткі, што не мог перанесці маруднага рытму навучання. Найлепш мовы вывучаліся яму аднаму. Матывіроўка — пераклады з прыгожага пісьменства.

Яшчэ ў шасцідзесятыя гады вучэльні ўсяго свету запрашалі Іштвана Дабі. На жаль, тагачасныя венгерскія ўлады, апасаючыся, каб не стаў ён шпіёнам з-за ведання столькіх моў, закрылі яму дарогу да навуковай кар'еры. Ніхто не верыў, што можна апанаваць столькі моў. Казалі, што такога чалавека ў свеце няма. А сям'я Дабіх у той час мусіла пакінуць камфорт сталічнага жыцця. Не мелі за што ўтрымацца. Тое, што змаглі ўратаваць, каб увогуле не застацца без даху над галавой і не жабраваць у метро, дазволіла купіць малую вясковую хатку 70 кіламетраў ад Будапешта, у вёсцы Тапіобічке, вядомай м.інш. з пераможнай бітвы венграў у 1849 г. Жыццё мінае ім у досыць прымітыўных умовах у стогадовай хаціне, у вялікім агародзе. Сядзяць у гэтым „скансэне", як называе Галіна, „два галубкі". Іштван Дабі сваё жыццё апісаў у кнізе „Аб мовах і навучанні чужаземным мовам... і штосьці яшчэ", цяпер стварае твор свайго жыцця, анталогію свету — пераклады з больш за ста моў. І Галінка, магістр раманістыкі — ужо пенсіянерка. Толькі Клубу пенсіянера ў Беме яна ўдзячная за падтрымку. Дзякуй Богу, абое здаровыя.

Міра Лукша



***

веру ў праўдзівую любоў у праўдзівую дружбу
напяваў ідучы дадому
а ў спальні застаў сваю жонку
у абдымках свайго найлепшага сябра

***

думаў
што гэта ўжо канец
хоць толькі што распачалося
яго самастойнае жыццё

***

мы навучыліся мінулага
прадбачым будучае
толькі сучаснага
разумець не можам

***

у дэфармаваных педагогамі
і кнігамі
клетках мозгу
нарадзілася адна зграбная думка

але пасля хвілінкі яе таксама забыў

***

на апусцелых вуліцах
гарадоў заваленых заразай раўнадушнасці
пакінутыя дамы
з тугой аб людскіх галасах
мараць аб любві

***

пад халоднай паверхняй зямлі
гарачае сэрца б'е
толькі мы не разумеем
яго слова

***

ты вучыўся зашмат
і ведаеш вельмі многа
і хочаш занадта многа

можа ёсць лепей не вучыцца
не ведаць
не хацець
нічога

***

устаў засмучаны
недахопам грошай
але перад варотамі
знайшоў выпхнуты кашалёк
толькі калі хацеў плаціць

Іштван ДАБІ, Будапешт

Восьмы нумар

Паявіўся новы нумар ліатартурна-мастацкага і беларусазнаўчага часопіса, гадавіка, выдання Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа", пад рэдакцыяй праф. Яна Чыквіна. У літаратурнай частцы можам прачытаць творы Юрыя Баены (нізка вершаў „Пад гэтым небам"), Янкі Юхнаўца (аповесць „Яно"), Марылі Базылюк (вершы „Фіялка травы роснай") Альбіны Сямёнавай (апавяданне „Лямпа Псіхеі"), Зьніча (вершы „Сутонне золкам адгукнецца") Уладзіміра Правідохіна (рэфлексіі „Мы вандроўнікі"), Дзмітра Шатыловіча (верш „Успаміны полацкай княгіні Прадславы"), Сакрата Яновіча (апавяданні). У раздзеле „Літаратуразнаўства" Ала Петрушкевіч разважае пра паэзію Наталлі Арсенневай, Арнольд Макмілін пра творчае пабрацімства Быкава і Барадуліна, Лада Алейнік пра прозу Міхася Андрасюка, Мікола Мікуліч пра паэзію Сяргея Крыўца. У культуралагічным раздзеле Рыгор Шаура піша пра народныя асновы ў іканапісе, а Анна Дэмянюк разглядае творчы шлях Тамары Сапланевіч. Спрабавалі сваіх літаратурных сіл і студэнты — Анна Садоўская, Юстына Грыцюк (вершы) ды Аліна Масайла, Анна Чаломей, Марта Сельвясюк, Віялета Саевіч і Анна Сасноўская ў „Звычайных занатоўках". **(лук)**

prof. Stanisław Waltoś, Uniwersytet Jagielloński: „Kto rządzi prokuraturą i Najwyższą Izbą Kontroli, ten ma w Polsce prawdziwą władzę”.
Igor T. Miecik,
Prokuratot na służbie
„Polityka” 43, 23-10-2004 r.

Ніва
ПАДАЗРОНАЯ

Знамянальнай стала салідарнасць з намі беларусаў усяго свету. Упершыню адчувалася, што існуе ў свеце беларуская нацыя, што калі бюць беларусаў у Беластоку, боль адчуваюць у Мінску, Гродне, Вільні, у дыяспары, што ў Еўропе, Аўстраліі і Амерыцы...

Яўген Мірановіч ☞ II-III

Зварот прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі

Прэзыдэнту Рэспублікі Польшчы
Маршалку Сойму Польшчы
Міністру замежных спраў Польшчы
У амбасаду Польшчы ў Рэспубліцы Беларусі

Падзеі апошняга часу, якія адбываюцца на Беласточчыне ў дачыненьні да тамтэйшых беларусаў, усхвалявалі беларускую грамадзкасьць і ў Беларусі. Пасьля ўваходжаньня Польшчы ў Эўразьвяз здавалася, што разьвіцьцё нацыянальных меншасьцяў у краіне стане адным з прыярытэтных кірункаў унутранай палітыкі дзяржавы. Гэта неаднаразова дэкляравалі першыя асобы Рэчы Паспалітай. Таму дэмакратычныя сілы Беларусі, якія сёньня дзеюць у вельмі цяжкіх умовах, не без падстаў разьлічвалі на тое, што Польшча, якая ў свой час мела вялікую падтрымку заходняга сьвету, будзе працягваць традыцыі пашырэньня дэмакратыі на ўсход. Зусім нядаўняя заява польскага сойму, па сутнасьці, пацьвярджае гэта. Але ня менш важным кірункам такой падтрымкі ёсьць спрыяньне беларускім дэмакратычным колам у Польшчы. Такой плыньню на Беласточчыне ўжо шмат гадоў зьяўляецца асяродак, які склаўся вакол штотыднёвіка „Ніва”. Гэтая газэта — правадзнік эўрапейскай дэмакратыі ня толькі сярод беларусаў Польшчы, яе існаваньне — гэта значная маральная падтрымка беларусам метраполіі, дзе сёньня ўсялякімі спосабамі нішчыцца незалежны дэмакратычны друк.

Але замест гэтага на Беласточчыне знайшліся сілы, якія распачалі дзеяньні дыскрымінацыйнага характару ў дачыненьні да беларускай меншасьці ў Польшчы. Па сутнасьці, ідзе зьнішчэньне штотыднёвіка „Ніва” і праз гэта — праяў нацыянальнага самавыяўленьня беларусаў у Польшчы. Тое, што такія дзеяньні супалі з момантам абвастрэньня перасьледу дэмакратычных сілаў у Беларусі і маючымі адбыцца выбарамі ў Польшчы, прыводзіць да думкі, што адбываецца выкананьне палітычнага заказу. Абвінавачаньне раённай пракуратурай Беластока-Поўдзень управы праграмнай рады тыднёвіка „Ніва” ўспрымаецца як форма запалохваньня беларускай грамадзкасьці ў Польшчы з мэтай выключэньня беларусаў Беласточчыны з палітычнага жыцьця краіны.

Зыходзячы з гэтага, заклікаем грамадзкасьць Польшчы і вярхоўныя ўлады краіны зьвярнуць увагу на сытуацыю, якая склалася вакол тыднёвіка „Ніва”. Мы перакананыя, што ў палітычных колах польскай дзяржавы дастаткова шмат здаровых сілаў, якія разумеюць недапушчальнасьць такой дыскрымінацыі і перасьледу людзей паводле нацыянальнай прыналежнасьці. Спадзяёмся, што здаровы сэнс возьме верх і беларуская меншасьць у Польшчы будзе мець права на сваё нацыянальнае выяўленьне.

Przeminęło z Niwą

Żeby dostać dotacje z ministerstwa białoruski tygodnik Niwa zawyżał nakład. Drukował 1200 egzemplarzy, Warszawie podawał 2200. Zawyżał nakład i koszty. Teraz może stracić dotacje, z których się utrzymuje.

Dotarliśmy do raportu NIK, z którego wynika, że w latach 2001-2002 we wnioskach o dotację wydawca Niwy zawyżał koszty aż o 39 procent. Niwa potrzebowała 699 tys. zł na działalność wydawniczą, ale Warszawie prosiła o 1,15 mln zł.

Ministerstwo dostało też nieprawdziwe dane na temat wysokości nakładu. Na przykład w 2002 roku Rada Programowa pisma dostała 310 tys. zł dotacji na wydanie 2200 egzemplarzy Niwy, podczas gdy przeciętny nakład wynosił niecałe 1200 egzemplarzy. Koszty wydawania przez dwa lata tygodnika były o 102 tys. niższe.

Znaczki razy dwa

Resort kultury dał też Niwie prawie 8 tys. zł na znaczki pocztowe, za które wrześniej zapłaciła Fundacja im. Stefana Bato-

spraw mniejszości narodowych w departamencie kultury. – Ministerstwo nie wyklucza, że wystąpi o zwrot części dotacji.

Wyrok śmierci

Wydawca Niwy prawdopodobnie nie będzie w stanie nic zwrócić, bo nie ma żadnych pieniędzy oprócz ministerialnych dotacji. – Zwyżowane żądania oznaczałyby koniec tygodnika – mówi Witalis Lubo, redaktor naczelny Niwy.

Być może Niwa przez trzy następne lata nie będzie mogła ubiegać się o dotację, ponieważ, według NIK, naruszyła ustawę o finansach publicznych. Jeśli resort kultury podzieli opinię Izby, to wyda wyrok śmierci na ukazujący się od 1956 roku tygodnik.

– Dzisiaj trudno powiedzieć, czy dotacje zostaną cofnięte – mówi Iwona Grodzka. – Ministerstwo Kultury chce tego uniknąć.

Nieoficjalnie dowiedzieliśmy się, że NIK na początku sierpnia zamierza też złożyć do prokuratury zawiadomienie w sprawie fałszowania dokumentów.

Zbigniew NIKITOROWICZ

Dużo kob
trochę ov
Pięć tysięcy mi
stoku nie ma to
jest cztery razy
ludzi, w Suwałk
ścisku – porów
największe mła
twie.

ŁOMŻA
Kupcy pła
dwa razy
Na prywatnym p
przy ulicy Sikors
opłatę pobieraj
miejscy. Dlacze
dwa razy? – dzie

JUTRO W
kurierTOP, a w
Koszyk Poranne
ceny w białostoc
Pora na przetw

POGODA
27

Зварот падпісалі наступныя асобы

Сяргей Антусевіч, дэпутат Гарадзенскага гарсавету
Уладзімір Арлоў, пісьменьнік
Алесь Астроўскі, прафэсар Гарадзенскага ўнівэрсытэту
Зьміцер Бартосік, бард
Лявон Баршчэўскі, старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтру
Дзьмітры Бугаёў, прафэсар БДУ
Валеры Булгакаў, рэдактар часопісу „ARCHE”
Алесь Бяляцкі, кіраўнік зачыненага праваабарончага цэнтру „Вясна”
Пятро Васючэнка, загадчык катэдры беларусістыкі МДЛУ
Мікола Воран, старшыня Гарадзкой Арганізацыі БНФ у Гродне
Тадэвуш Гавін, дзяяч Саюзу палякаў Беларусі
Адам Глёбус, пісьменьнік
Андрэй Дынько, рэдактар „Нашай Нівы”
Андрэй Казакевіч, палітоляг
Кася Камоцкая, бард
Сяргей Кручкоў, намесьнік старшыні Таварыства Беларускай Мовы
Алена Макоўская, старшыня Управы ЗБС „Бацькаўшчына”
Сяргей Мальчык, старшыня Гарадзенскай Абласной Арганізацыі БНФ
Мікола Маркевіч, рэдактар зачыненай „Пагоні”
Юры Пацюпа, паэт
Усевалад Рагойша, дацэнт БДУ
Пётра Садоўскі, пасол Беларусі ў Нямеччыне (1992—1994)
Віктар Сазонаў, журналіст
Анатоль Сідарэвіч, гісторык
Людка Сільнова, паэтка
Уладзімір Сіўчыкаў, выдавец
Андрэй Скурко, намесьнік рэдактара „НН”
Сяргей Сматрычэнка, першы намесьнік старшыні Беларускага ПЭН-Цэнтру
Юры Станкевіч, пісьменьнік
Валянцін Стэфановіч, праваабаронца
Валянцін Тарас, літаратар, перакладчык
Уладзімір Хільмановіч, Фонд імя Сапегі
Алесь Яўдаха, незалежны кнігараспаўсюднік
(...)
і яшчэ больш за сто чалавек

Праўда — за намі

Усё ж не магу паверыць, што была гэта кімсьці дакладна спланаваная акцыя супроць нашай меншасці. Але, на жаль, можна тое так менавіта ўспрыняць, гледзячы на паводзіны чыноўнікаў і пагражаючыя паслядоўнасці. Асабліва мяне непакоіць тое, што паліцыя і пракуратура весці расследаванне ў справе „Нівы” назначылі вось беларусам або іх жонкам/мужам палякам. Яны ў час допытаў пра гэта нам гаварылі. Казалі, што прасілі сваіх кіраўнікоў, каб іх вызвалілі ад гэтай справы. А тыя іх нават слухаць не хацелі.

Трэба яшчэ ўлічыць факт, што беластоцкі NIK узначальвае былы высокапастаўлены функцыянер Управы аховы дзяржавы (UOP), перайменаванай нядаўна ў Агенцтва ўнутранай бяспекі (ABW).

Я ад адказнасці не ўхіляюся. Не бачу аднак рацыянальных мерытарычных прычын дзеля аж так жорстка ведзенай справы. Відавочна камусьці фактычна вельмі хочацца акампраметаваць не столькі нашу эліту, колькі ўсіх беларусаў у Польшчы. Запалохаць іх, каб не ангажаваліся ў аніякую беларускую дзейнасць, а ў перапісах насельніцтва пісаліся толькі палякамі.

Усім нам вядома, што некаторым жыхарам Беласточчыны не падабаецца, што жыве тут налічваючая сама менш паўсотні тысяч грамадзкасць, якая лічыць сябе беларусамі. Праўда, ворагаў сярод звычайных палякаў з году ў год маем штораз менш. Жыццё паказвае, што асабліва малодшае пакаленне не пераймаецца, што ў рэгіёне пражываюць разам з імі не толькі палякі. Іх гэта нават цікавіць і шчыра ганарацца падляшскім шматкультур'ем. На жаль, сярод улад і ва ўстановах значны голас маюць тыя, якія хацелі б, каб нас наогул не было.

Я аднак веру, што пераможа розум і паводзіны чыноўнікаў будуць урэшце адпавядаць поглядам усяго грамадства. А мы, беларусы, усякую хлусню, якую хто б у наш бок не кіраваў, і так пераможам, бо за намі — праўда. Гістарычная праўда.

Юрка Хмялеўскі
старшыня Асацыяцыі беларускіх журналістаў

Przywalić kacapom

Справа „Нівы” паказвае як на практыцы выглядае цяперашняя нацыянальная палітыка на Беласточчыне. Пасля кантролю дакументаў функцыянерамі, якія выступалі пад шыльдай Найвышэйшай кантрольнай палаты, нехта вырашыў летам мінулага года паказаць беларусам іх месца ў Польшчы, а пры нагодзе танным коштам учыніць спектакль для натоўпу. Ажыццявілі яны добра спрактыкаваны сцэнарый з 1968 г., калі такія акцыі праводзіліся з удзелам яўрэйскага насельніцтва. Хто дакладна прымаў рашэнні па правядзенні акцыі супраць „Нівы”, пэўна, ніколі не даведаемся. Вядома, аднак, што ў беластоцкай дэлегатуры НІК сабраўся таксама адборны калектыў з аграмадным інтэлектуальным патэнцыялам здольным да паспяховага змагання за этнічную чысціню беластоцкіх крэсаў. Дырэктара Янухту, здаўна заангажаванага ў нацыянальны рух, успамагае былы шэф беластоцкай бяспекі (УОП) Мар’ян Мінкевіч, які патрыятычным заангажаваннем нічым не ўступае свайму начальніку. Пра НІКаўскую моладзь пэўна пачуем яшчэ не раз. Ёсць яшчэ на Беласточчыне шмат беларускіх арганізацый, школ, так што магчымым будзе зрабіць тут не адну кар’еру.

Акцыя НІК супраць „Нівы” не мела б ніякага сэнсу, калі б падобнага патрыятычнага заангажавання не праявілі мясцовыя польскія журналісты. Калі толькі Шэрлаку Холмсу беластоцкай журналістыкі падкінулі дакументы, той няшмат разумеючы іх змест адчуў, што прыйшоў час замацаваць за сабою славу бескампраміснага змагара з любымі парушэннямі законаў. Лепш трапна не маглі выбраць. Нікітаровіч, пішучы ў „Кур’еры паранным” пра здзейсненыя ў „Ніве” „злачынствы”, безупынна паўтараў, што ён і яго рэдакцыя як першыя атрымалі сакрэтныя дакументы кампраметуючыя „Ніву”. Мясцовы чытач, чытаючы гэтыя звесткі, з зайздрасцю мог канстатаваць: „Oni pierwsi dostąpili łaski własnoręcznie przywalić kacapom”. Найбольш характэрнае ў той час было тое, што так у сапраўднасці ніхто нават не хацеў ведаць у чым справа, але адчувалася, якую прыемнасць дае г.зв. беластоцкім элітам магчымасць

Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына”

выказвае глыбокую заклапочанасць і трывогу...

Сп. Рольфу Екеусу
Вярхоўнаму камісару па нацыянальных меншасцях АБСЕ
Сп. Алваро Гіль-Роблесу
Камісару па правах чалавека Савета Еўропы
Сп-ні Луізе Арбоур
Вярхоўнаму камісару па правах чалавека ААН

ЗВАРОТ

Міжнароднае грамадскае аб’яднанне „Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»” выказвае глыбокую заклапочанасць і трывогу ў сувязі з сітуацыяй, якая склалася вакол беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Па розных крыніцах у Рэспубліцы Польшча пражывае ад 50 да 350 тысяч беларусаў. Месцам найбольш кампактнага пражывання беларусаў з’яўляецца Беласточчына.

Сёння пэўнымі афіцыйнымі структурамі ў Рэспубліцы Польшча ініцыіруюцца праверкі Найвышэйшай кантрольнай палатай школ з дадатковым навучаннем беларускай мове, патрабаванні ад бацькоў штогадовых дэкларацый адносна навучання дзяцей на роднай мове. Апошнім крокам сталі захады па закрыцці штотыднёвіка беларусаў Польшчы „Ніва”.

Газета „Ніва”, што паўстала ў 1956 г. у Беластоку на хвалі адраджэння беларускай культуры, стала адметным цэнтрам у пашырэнні беларускага друкаванага слова сярод беларускага грамадства ў Польшчы. Неацэнная яе роля ў падтрымцы беларускага школьніцтва, фарміраванні ў моладзі светапогляду, заснаванага на грамадзянскім патрыятызме, павазе да краіны пражывання і шчырай любові да этнічнай культуры.

Ва ўціску на тыднёвік „Ніва” і тым самым на беларускую нацыянальную меншасць Польшчы бачыцца трывожны сімптом і рэцыдыў палітыкі 1970-х гадоў, калі частка беларускіх і адукацыйных устаноў у краіне была папросту скасаваная, а беларускае пісьменства, мова і школьніцтва апынуліся на мяжы знікнення.

У той час, як увесь свет сёння салідарызуецца з нацыянальна-дэмакратычнымі інстытутамі ў Беларусі і беларускімі супольнасцямі ў іншых краінах, якія вядуць няпростае змаганне за пабудову ў Рэспубліцы Беларусь сапраўды дэмакратычнага грамадства і вяртанне дзяржавы ў еўрапейскую цывілізацыйную прастору (згадаем „Акт падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі”, адпаведныя заявы афіцыйных структур Еўразвяза) пазіцыя польскіх уладаў выглядае не зусім адэкватнай, як для краіны нядаўна прынятай у Еўразвяз. Відавочна, што вымушанае спыненне выхаду тыднёвіка „Ніва” паслабіць не толькі беларускую нацыянальную супольнасць у Польшчы, але і ў самой Рэспубліцы Беларусь негатыўным чынам адаб’ецца на працэсе дэмакратызацыі і нацыянальнага адраджэння.

Мы лічым, што працэсы, якія зараз ідуць у дачыненні да беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы парушаюць Рамачную канвенцыю аб ахове нацыянальных меншасцяў, якую Польшча ратыфікавала ў 2000 г. і якая была прынятая Саветам Еўропы ў 1995 г.

Зыходзячы з гэтага, МГА ЗБС „Бацькаўшчына”, выказваючы думку шырокай беларускай грамадскасці ў свеце просіць звярнуць увагу на сітуацыю, якая склалася вакол тыднёвіка „Ніва”. Спадзяемся, што з Вашай дапамогай, беларуская меншасць у Польшчы будзе мець права на сваё нацыянальнае выяўленне, у тым ліку праз захаванне адзінага на сёння ў Польшчы друкаванага органа беларусаў — газеты „Ніва”.

Управа МГА ЗБС „Бацькаўшчына”
12.10.2004 г.

Расце аўтарытэт „Нівы” ў беларусаў Балтыйскага рэгіёна...

Заява Рады Латвійскага таварыства беларускай культуры „Сьвітанак”

З трывогай і хваляваньнем беларусы, аб’яднаныя ў Латвійскае таварыства беларускай культуры „Сьвітанак”, успрымаюць сітуацыю, якая ў апошні час складваецца вакол тыднёвіка беларусаў Польшчы „Ніва”, у прыватнасьці, і вакол беларускіх грамадзкіх арганізацый Польшчы наогул.

Лічым патрэбным адзначыць, што ў апошні час тыднёвік беларусаў Польшчы „Ніва” набывае ўсё большую вагу не толькі ў мясцовай інфармацыйнай прасторы Беластоцкага рэгіёна Польшчы. Расьце аўтарытэт выданьня як у беларусаў Латвіі, так і ўсяго Балтыйскага рэгіёна. Для нас тыднёвік „Ніва” — гэта не толькі крыніца інфармацыі аб жыцьці беларусаў у суседняй з намі краіне Еўразьвязу, але і рэальная магчымасьць ліквідацыі інфармацыйнай ізаляванасьці ў асьвятленьні жыцьця часткі беларускай дыяспары дэмакратычнага накірунку ў краінах, якія сёлета ўступілі ў Еўразьвяз. Таму такую вялікую заклапочанасьць выклікаюць у нас падзеі, якія зараз разгортваюцца ў Польшчы. Лічым неабходным выказаць сваю падтрымку Праграмнай радзе тыднёвіка „Ніва” і далучыць свой голас у абарону адзінага беларускага штотыднёвіка ў краінах ЕЗ і адзінага друкаванага сродка масавай інфармацыі, які маюць магчымасьць рэгулярна атрымліваць беларусы Балтыйскага рэгіёна.

У сваю чаргу мы верым, што разглядаючы справу тыднёвіка „Ніва” польскія ўлады будуць кіравацца перш за ўсе дэмакратычнымі прынцыпамі, якія гарантуюць роўныя правы ўсім сваім грамадзянам, незалежна ад іх этнічнай прыналежнасьці. Гэта дае нам надзею спадзявацца, што „Ніву” не напаткае лёс загубленых беларускамоўных газет і яшчэ доўгі час газета будзе чаканым госьцем і крыніцай аб’ектыўнай інфармацыі ня толькі ў сем’ях беларусаў Польшчы, але і за яе межамі.

Рада Латвійскага таварыства беларускай культуры „Сьвітанак”, *Рыга, 13.10.04*

«Саюз беларускіх пісьменнікаў»

220034, Беларусь, Мінск, вул. Фрунзе, 5. Тэл.(факс): 236-03-48. E-mail: sbp@tut.by
УНН 100361438, р/р 36220000000087 у філ.511 АСБ «Беларусбанк», код 815

116/П

20 кастрычніка 2004 г.

Прэзідэнту Рэспублікі Польшча
сп. Аляксандру КВАСЬНЕЎСКАМУ

Амбасадару Рэспублікі Польшча ў Беларусі
сп. Тадэвушу ПАЎЛЕКУ

копія: **Праграмнай Радзе тыднёвіка «Ніва»**

Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў шчыра занепакоены і заклапочаны сітуацыяй, што склалася апошнім часам вакол тыднёвіка беларусаў у Польшчы «Ніва» і беларускага школьніцтва на Беласточчыне. Праверкі, праведзеныя Найвышэйшай кантрольнай палатай у рэдакцыі тыднёвіка «Ніва» і ў школах, дзе вывучаецца беларуская мова, на наш погляд, мелі характар зусім не эканамічны. Складваецца ўражанне, што ў Рэспубліцы Польшча пачаўся спланаваны наступ на цэнтры нацыянальнага жыцьця беларускай нацыянальнай меншасці, якая, паводле афіцыйных вынікаў перапісу 2002 году, складае больш як 50 тысяч чалавек і кампактна жыве на Беласточчыне. Гэта адбываецца на тле таго, што кіраўніцтва беларускай дзяржавы, заклапочанае ўнутрыпалітычнымі праблемамі, найменш увагі надае працэсам, якія адбываюцца за межамі краіны і зусім не цікавіцца жыццём суайчыннікаў у суседніх з Беларуссю дзяржавах.

Мы з вялікай павагай назіралі за тым, як у Польшчы аберагаецца і захоўваецца культура і мова беларусаў: працуюць школы, праводзяцца фестывалі, выходзіць тыднёвік «Ніва», друкуюцца кнігі беларускіх аўтараў, у той час як на бацькаўшчыне няспынна скарачаецца колькасць беларускамоўных школ і выданняў. Нас цешыла надзея на тое, што стаўшы сябрам Еўрасаюзу, Рэспубліка Польшча яшчэ больш увагі надасць развіццю культуры нацыянальных меншасцяў, у тым ліку і беларускай.

На жаль, факты паказваюць, што адбываецца адваротнае. Нам стала вядома, што сябрам Праграмнай Рады тыднёвіка «Ніва» Яўгену Вапу, Яўгену Мірановічу, Міхасю Андрасюку, Юры Хмялеўскаму і Міхалу Стэльмашуку пракуратура Беластоку вылучыла абвінавачаньне ў нібыта няправільным выкарыстаньні грашовых сродкаў, якія выдаткоўваліся польскай дзяржавай на падтрымку «Нівы». Цяпер ім пагражае пазбаўленне волі на тэрмін ад пяці да васьмі гадоў. Такая неапраўданая жорсткасць у адносінах да лідэраў наводзіць на думку пра спланаваную акцыю, скіраваную супраць беларускай нацыянальнай меншасці з мэтай выключыць беларусаў з грамадскага і палітычнага жыцця Польшчы.

Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў звяртае ўвагу польскай дзяржавы на сітуацыю, што склалася на Беласточчыне, і настойліва просіць далікатна і справядліва падыйсці да яе разгляду і вырашэння. Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў спадзяецца, што беларуская нацыянальная меншасць на Беласточчыне будзе і надалей атрымліваць усебаковую падтрымку з боку польскай дзяржавы і мець магчымасць зберагаць сваю культуру і спадчыну.

Адначасова Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў выказвае сваю падтрымку і салідарнасць з дзейнасцю беларускіх нацыянальных арганізацый і іх лідэраў у Польшчы і зычыць ім плённай працы і мужнасці.

Ад імя Сакратарыяту Саюза беларускіх пісьменнікаў –

Першы намеснік старшыні
Саюза беларускіх пісьменнікаў **Барыс Пятровіч (Сачанка)**

Грамадскае аб'яднанне «Саюз беларускіх пісьменнікаў»

stosowanie zapisów księgowych uniemożliwiających jednoznaczne ich powiązanie z dokumentami księgowymi, błędne ujmowanie w raportach kasowych dokumentów dotyczących kosztów, ewidencjonowanie faktur z poprzedniego okresu sprawozdawczego w następnym okresie sprawozdawczym, nie sporządzanie zestawienia obrotów i sald księgi głównej i ksiąg pomocniczych na koniec okresów miesięcznych i na dzień zamknięcia ksiąg, nie ujmowanie w księgach rachunkowych przychodów ze sprzedaży, nie stosowanie na dokumentach księgowych zapisów informujących o dokonaniu kontroli merytorycznej, formalnej i rachunkowej, nie sporządzanie inwentaryzacji aktywów i pasywów,

tj. o przestępstwo z art.77 ust.1 Ustawy o rachunkowości z dnia 24 września 1994 r.

II. w latach 2001 i 2002 w Białymstoku, jako przewodniczący Rady Programowej Tygodnika „NIWA" i jednocześnie przewodniczący Zarządu, będąc wraz z innymi członkami Zarządu - Eugeniuszem Wappa, Michałem Stelmaszukiem, Michałem Androsiukiem i Jerzym Chmielewskim - osobą odpowiedzialną za sporządzanie sprawozdań finansowych, nie dopełnił ciążącego na nim obowiązku i wbrew przepisom ustawy zaniechał sporządzania w/w sprawozdań w których winien był odzwierciedlić gospodarkę finansową zarządzanej jednostki,

„przywalić Białorusom". Адазваліся першабытныя этнічныя інстынкты, але тады яны толькі разбуджаліся, каб праявіцца ў поўным маштабе восенню гэтага года.

Можна сабе толькі ўявіць з якой асалодай хвалю нянавісці да „Нівы", якая пралілася ў масмедыях у першых днях кастрычніка, успрымалі ў беластоцкай дэлегатуры НІК. Усё пэўна прайшло лепш чым сабе там уяўлялі. Пракуроры грымелі на хвалях Радыё Беласток і ў газетах, аб'яўляючы ўсяму свету якой вялікай пагрозай для Польшчы з'яўляецца дзейнасць Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва", а беластоцкая свабодная прэса кожнага дня пашырала спісак злачынстваў з нашым удзелам. Нават „правдзівы поляк" Ян Онішчук, журналіст часопіса для ломжынскай дробнай шляхты — „Кантакты" — не сумняваўся ў тым, што выдаўцы беларускай газеты гэта злачынцы. Уся „руская" гміна перапалоханым голасам шаптала: „Навошта вам, хлопцы, гэтыя газеты, школы і нікому непатрэбная мова, навошта іх раздражняць". Зноў у вушах беларускага насельніцтва рэхам прагучэлі злавесныя словы „Бурага" і яму падобных: „Zapamiętajcie, k..., że tu jest Polska i nie ma na tej ziemi miejsca dla żadnych Białorusinów".

Салідарнасць з „Нівай" праявілі ў той час усе беларускія журналісты, амаль усе дзеячы беларускіх арганізацый і беларусы, якія ніколі не ангажаваліся ў нацыянальнае жыццё. Нахабная прапаганда польскіх медыяў успрымалася як звычайная агрэсія. Шмат хто званіў з пытаннем: „Як можам вам дапамагчы?" Нікога асабліва не здзіўляла тое, што нейкая дзяржаўная ўстанова праводзіць антыбеларускую дзейнасць. Гэта як бы стан нармальны ў гісторыі нашага народа. Атмасфера на Беласточчыне ўсім вядомая. Знамянальнай стала салідарнасць з намі беларусаў усяго свету. Упершыню адчувалася, што існуе ў свеце беларуская нацыя, што калі б'юць беларусаў у Беластоку, боль адчуваюць у Мінску, Гродне, Вільні, у дыяспары, што ў Еўропе, Аўстраліі і Амерыцы.

Арганізатары антыбеларускай акцыі хіба чакалі іншых вынікаў, напэўна не кансалідацыі беларускай грамадскасці на Беласточчыне. Аднак, у іх руках дзяржаўныя ўстановы, улада і прапаганда. У іх атручанай ядам нянавісці свядомасці 50 тысяч беларусаў гэта пагроза для Польшчы і палякаў. Таму спектакль, які пачаўся вясной мінулага года, будзе яшчэ працягвацца.

Яўген Мірановіч
(падазроны)

Сп. Аляксандру Кваснеўскаму,
Прэзідэнту Рэспублікі Польшча
Сп. Юзэфу Алексы,
Маршалку Сейма Польшчы
Сп. Владзімежу Цімашэвічу,
Міністру замежных спраў Польшчы
Сп. Амбасадару Польшчы ў Злучаных Штатах Амерыкі

Беларуская суполка ў Чыкага з непакоем адсочвае сітуацыю, якая склалася зараз вакол тыднёвіка беларусаў у Польшчы „Ніва" (Беласток). Газета „Ніва" пачынаючы з 1956 г. адыгрывае незаменную ролю ў захаванні беларускай тоеснасці і незалежнай ідэі не толькі ў Польшчы, але і ў самой Беларусі. „Ніва" карыстаецца заслужанай павагай у асяродках беларускай дыяспары на ўсіх кантынентах.

На жаль, на Беласточчыне знайшліся сілы, якія распачалі дзеянні дыскрымінацыйнага характару ў дачыненні да беларускай меншасці ў Польшчы. Па сутнасці ідзе знішчэнне штотыднёвіка „Ніва" і праз гэта праяваў нацыянальнага выяўлення беларусаў у Польшчы. Абвінавачванне раённай пракуратурай Беласток-Поўдзень управы праграмнай рады тыднёвіка „Ніва" ўспрымаецца намі як форма запалохвання беларускай грамадскасці ў Польшчы з мэтай выключэння беларусаў Беласточчыны з палітычнага жыцця краіны.

Ва ўціску на тыднёвік „Ніва", у праверцы Найвышэйшай кантрольнай палаты школ з дадатковым навучаннем беларускай мове, у патрабаванні ад бацькоў штогадовых дэкларацый адносна навучання дзяцей на роднай мове бачыцца трывожны сімптом і рэцыдыў палітыкі 1970-х і 1930-х гадоў, калі частка беларускіх адукацыйных устаноў у Польшчы была папросту скасаваная, а беларускае пісьменства, мова і школьніцтва апынуліся на мяжы знікнення.

Беларуская суполка ў Чыкага спадзяецца, што вярхоўныя ўлады Польшчы, краіны, якая нядаўна стала паўнавартасным сябрам Еўразвязу, звернуць увагу на сітуацыю, якая склалася вакол тыднёвіка „Ніва" і спыняць пераслед людзей паводле нацыянальнай прыналежнасці. Спадзяемся, што беларуская меншасць у Польшчы будзе мець права на нацыянальнае выяўленне.

Па даручэнню Беларускага Каардынацыйнага Камітэта ў Чыкага
Ванкарэм Нікіфаровіч
18 кастрычніка 2004 г.

THE FEDERAL COUNCIL OF BELARUSIAN ORGANISATIONS IN AUSTRALIA
ФЭДЭРАЛЬНАЯ РАДА БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ У АЎСТРАЛІІ

55 Marion St, Altona North. Vic. 3025
Telephone / Facsimile (61-3) 9391 4620

October 19, 2004

President Aleksander Kwasniewski
Prezydent Rzeczypospolitej Polskiej
Kancelaria Prezydenta RP
Ul. Wiejska 10, 00-902
Warszawa Polska

Dear President Kwasniewski,

The Federal Council of Belarusian Organisations in Australia ("FCBOA") has great concerns regarding the present situation within the Belarusian weekly Newspaper "NIWA" which has served the Belarusian community in Poland since 1956 until today. In addition, our concerns also extend to the educational curriculum offered to the Belarus community within Poland.

Firstly, the "NIWA" publication has a major role for the national Belarusian community in Poland and provides the link for the Belarusian community within Poland and provides readers independent views in Poland and in Belarus. The "NIWA" newspaper is a popular publication around the world including here in Australia.

Regrettably we understand the authorities within the 'Bielastock' region have suddenly applied pressure towards the publication with a view to discriminate and silence the Belarusian community within Poland. We understand that the objective is to deny our community with political freedom.

Змагаліся за дэмакратычную Польшчу...

Заява рады Гродзенскай філіі Грамады (БСДГ)

Сітуацыя, якая склалася вакол штотыднёвіка „Ніва" вельмі хвалюе беларускую грамадскасць. Дэмакратычныя сілы Беларусі, якія сёння дзеюць у вельмі цяжкіх умовах, не без падстаў разлічвалі на тое, што Польшча, якая ў свой час мела вялікую падтрымку Заходняга свету, будзе працягваць традыцыі пашырэння дэмакратыі на ўсход. Зусім нядаўняя заява польскага Сейма па сутнасці пацвярджае гэта. Але не менш важным кірункам такой падтрымкі ёсць падтрымка беларускіх дэмакратычных колаў у Польшчы. Такой плынню на Беласточчыне ўжо шмат гадоў ёсць асяродак, які склаўся вакол штотыднёвіка „Ніва". Гэтая газета ёсць праваднікам еўрапейскай дэмакратыі не толькі сярод беларусаў Польшчы, яе выпуск ёсць значнай маральнай падтрымкай беларусам метраполіі, дзе сёння ўсялякімі спосабамі нішчыцца незалежны дэмакратычны друк.

Але замест гэтага на Беласточчыне знайшліся сілы, якія распачалі дзеянні дыскрымінацыйнага характару ў дачыненні да беларусаў, якія жывуць у Польшчы. Падобна, што многія ў Польшчы ўжо забыліся, што ў часы ваеннага становішча, менавіта гэтыя беларусы змагаліся за незалежную дэмакратычную Польшчу. Што менавіта гэтыя беларусы разам з польскімі патрыётамі змагаліся супраць камуністычнай сістэмы. Для гэтых людзей справядлівасць і змаганне за праўду заўсёды былі галоўным. Таму жаданне захаваць беларускасць на тэрыторыі Польшчы, дзе жывуць беларусы, ёсць натуральным і неабходным.

Тое, што дзеянні па знішчэнні штотыднёвіка „Ніва" і праз гэта праяваў нацыянальнага выяўлення беларусаў у Польшчы супалі з момантам абвастрэння пераследу дэмакратычных сілаў у Беларусі і маючымі адбыцца выбарамі ў Польшчы прыводзяць да думкі, што адбываецца выкананне палітычнага заказу. Абвінавачванне раённай пракуратурай Беласток-Поўдзень управы Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва" ўспрымаецца як форма запалохвання беларускай грамадскасці ў Польшчы з мэтай выключэння беларусаў Беласточчыны з палітычнага жыцця краіны.

Патрабуем спыніць пераслед газеты і даць беларусам Польшчы рэальнае права на выяўленне.

Прэзідэнту Рэспублікі Польшча Аляксандру Квасьнеўскаму
Маршалку Сейма Рэспублікі Польшча Юзафу Алексы
Міністру замежных справаў Рэспублікі Польшча Владзімежу Цімашэвічу
У Амбасаду Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь

Заява Гарадзенскай філіі Грамадскага аб'яднання „Беларуская асацыяцыя журналістаў"

Выказваем глыбокую занепакоенасць падзеямі, якія адбываюцца вакол незалежнага тыднёвіка беларусаў Польшчы „Ніва" і яго выдаўцоў — сяброў управы Праграмнай рады Яўгена Мірановіча, Яўгена Вапы, Міхала Андрасюка, Юрыя Хмялеўскага і Міхала Стэльмашука.

Мы ведаем гэтых людзей, як прыстойных, сумленных і адказных грамадзянаў. Таму выклікае здзіўленне інфармацыя, што гэтыя аўтарытэтныя дзеячы беларускага грамадскага і палітычнага жыцця ў Польшчы абвінавачваюцца ў парушэнні законаў. Асабліва нас непакоіць тое, што беларусамі Беласточчыны падобныя абвінавачанні ўспрымаюцца як ціск з мэтай выключэння іх з палітычнага і грамадскага жыцця Польшчы.

Газета „Ніва", яе журналісты і выдаўцы, заўсёды падтрымлівалі нас, гарадзенскіх журналістаў, у імкненні да свабоды і дэмакратыі ў нашай краіне.

Яўген Мірановіч, Яўген Вапа, Міхал Андрасюк, Юры Хмялеўскі і Міхал Стэльмашук ніколі не давалі падставаў сумнявацца ў сваёй сумленнасці. Маем надзею, што пры ўсебаковым і аб'ектыўным падыходзе, крымінальная справа супраць іх будзе спыненая.

Ад імя сяброў Гарадзенскай філіі БАЖ.

Старшыня філіі Павал Мажэйка
21 кастрычніка 2004 года

Wracamy do tematu

Gafa z zarzutami?

Część zarzutów, które policja i prokuratura stawia trzem członkom zarządu rady programowej tygodnika „Niwa", to prawdopodobnie pomyłka. Dlaczego? Bo w czasie, kiedy mieli popełnić zabronione czyny, nie byli jeszcze w zarządzie rady.

Formalnym wydawcą tygodnika jest zarząd rady programowej tygodnika „Niwa", do której przedstawicieli delegują organizacje mniejszości białoruskiej.

Pomyłka w datach

Przypomnijmy, że sprawę nieprawidłowości w „Niwie" prowadzi policja pod

– W 2001 roku nie byłem członkiem zarządu rady programowej – zapewnia Jerzy Chmielewski. – Dlatego stawianie takiego zarzutu uważam za dużą gafę policji i prokuratury. Z jednej strony ta sprawa może świadczyć o nadgorliwości policji, a z drugiej o panującym w niej bałaganie.

Złapali za kołnierz

Jak ustalił „Poranny", wybory do zarządu rady programowej „Niwy" odbyły się 15 marca 2002 roku. Ze starego, siedmioosobowego składu zarządu zostali wówczas ponownie wybrani tylko prof. Eugeniusz Mironowicz i Eugeniusz Wappa. Zaś Jerzy Chmielewski dopiero 15 marca zadebiutował z zarządzie rady